

ЯК ЗДЫМАЮЦЬ СЕРЫЯЛ ПРА РАЗМІНЁРАЎ 9

БЫТАВАЯ ТЭХНІКА: ПАТРЭБНАЯ І НЕ ВЕЛЬМІ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 ВЕРАСНЯ 2021 г. СУБОТА № 175 (29544)


## ЛІЧБА ДНЯ

**7,6 тысячы чалавек**

*стаялі на ўліку ў якасці беспрацоўных на 1 верасня гэтага года, паведаміла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны краіны. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на 1 верасня склаў 0,2 % і ў параўнанні з 1 верасня 2020 года не змяніўся. Гэты паказчык у Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях склаў 0,3 %, у Мінску, Гомельскай і Мінскай абласцях — 0,1 %. У лікавым выражэнні больш за ўсё афіцыйна беспрацоўных зарэгістравана ў Брэсцкай вобласці — 1,5 тыс. чалавек, менш за ўсё ў Мінску — 700 чалавек. Вакансій для беспрацоўных больш чым дастаткова. На 1 верасня заяўлены звесткі аб 93,4 тыс. свабодных працоўных месцаў, што на 20,5 % больш, чым год таму. Попыт на рабочыя прафесіі пераважае — 66,4 % ад агульнай колькасці вакансій.*

## КОРАТКА

- **Мікалай Шкрэд прызначаны намеснікам начальніка Службы бяспекі Прэзідэнта.**
- У Беларусі ствараецца сістэма грамадскіх інспектараў.
- **«Белавія» павялічвае колькасць рэйсаў у гарады Расіі.**
- Дзмітрый Шаўцоў узначаліў Беларускі Чырвоны Крыж.
- **Інфляцыя ў Беларусі ў жніўні склала 0,2 %.**
- Акцыя «Цвярозы кіроўца» праходзіць у Мінскай вобласці.
- **Коласаўскі тэатр у 96-м сезоне пакажа больш чым шэсць прэм'ер.**

# ПРЫГАЖОСЦЬ ЗНЕШНАСЦІ І ДУШЫ

**Менавіта па гэтых крытэрыях выбіралі ўчора «Міс Беларусь»**




Фота БелТА.

У чым прыгажосць? Як выбраць найлепшую з самых прыгожых? Такім пытаннем, верагодна, задавалася журы падчас падрыхтоўкі нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь». З амаль паўсотні прэтэндэнтак да паўфіналу ў красавіку-маі ім прыйшлося адабраць толькі 110, з іх да фіналу — усяго 29.

Такая няпростая задача была ўскладзена арганізатарамі на плечы журы, у складзе якога сапраўдныя эксперты не толькі ў жаночай прыгажосці, але і ў сваёй справе — оперны спявак Уладзімір Громаў, дырэктар «Нацыянальнай школы прыгажосці» Алена Троіцкая, дэпутат, «Міс Беларусь — 2018» Марыя Васілевіч, гендырэктар «Крыстал-Холдынг» Руслан Саракавы, старшыня Маладзёжнага парламента Ягор Макарэвіч, рэктар БДУКМ Наталля Карчэўская, дацэнт кафедры БДАМ Канстанцін Касцючэнка, кампазітар Яўген Алейнік, балерына Вольга Гайко, гандбаліст Сяргей Рутэнка і «Міс Сусвет» Аксана Фёдарава.

Шоу ўчора вечарам у Палацы спорту — фінальны этап «Міс Беларусь — 2021», лейтматыў якому задалі беларускія легенды і святы. Шоу складаецца ўмоўна з пяці блокаў, дзе апісваюцца мінулае, сучаснасць і будучыня краіны, яе духоўнае багацце, традыцыі і дасягненні. У кожным блоку — дэфіле прыгажунь у розных касцюмах.

Прысутнічаў на фінальным этапе і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Галоўная прыгажуня Беларусі была вызначана позна ўвечары. Яна прадставіць краіну на «Міс свету».

Падрабязнасці — **www.zviazda.by.**

**Марыя ДАДАЛКА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# МІНСК ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

**У гэтыя выхадныя сталіца святкуе свой 954-ы дзень нараджэння.**

Абітурыент-2022

# ТЭХНІЧНАЯ ЭЛІТА

**Прафесійная адукацыя становіцца ўсё больш інтэлектуальнай...**

**Тыдзень «Твая прафесійная адукацыя» пройдзе з 27 верасня да 3 кастрычніка. На працягу сямі дзён школьнікі змогуць удзельнічаць у віртуальных экскурсіях па каледжах і ліцэях нашай краіны, знаёміцца з адукацыйным працэсам і пазакласным жыццём іх навучэнцаў. Таксама анлайн можна будзе трапіць на інавацыйныя прадпрыемствы і пабачыць, як выглядаюць сучасныя рабочыя месцы.**

На думку **рэктара Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерыя ГАЛУБОЎСКАГА,** вельмі карысным будзе далучыцца да гэтых мерапрыемстваў і бацькам старшакласнікаў, якія моцна ўплываюць на прафесійны выбар сваіх дзяцей.

— Стэрэатып, быццам бы ў рабочых некваліфікаваная і непрэстыжная праца, а прафесійна-тэхнічная адукацыя — толькі для няўдачнікаў, сёння не актуальны, — падкрэслівае ён. — Папершае, патрэба ў прадстаўніках рабочых прафесій і спецыялістах сярэдняга звяна пастаянна расце. Паводле прагнозаў футуролагаў, 80 працэнтаў існуючых сёння прафесій застануцца, але трансфармуюцца пад уздзеяннем «лічбы». Прафесійная адукацыя становіцца ўсё больш інтэлектуальнай. Сучасны рабочы — гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які, акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г. д.


СТАР. 10



ISSN 1990 — 763X



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2021 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «РОЛЯ ОРГАНАЎ СЛЕДСТВА ЎЗРАСТАЕ»

### Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся ў Палацы Незалежнасці са старшынёй Следчага камітэта Расіі Аляксандрам Бастрыкіным

**Аляксандр Лукашэнка ў пачатку размовы падзякаваў суразмоўцу за візіт і адзначыў яго важнасць у сувязі з тым, што ў нашай краіне не так даўно Следчы камітэт узначаліў новы кіраўнік. Дзмітрый Гара прызначаны на пасаду кіраўніка СК Беларусі сёлетняй вясной.**

«Вельмі важна напачатку вопытнаму прафесіяналу сустрэцца з нашым маладым старшынёй, падказаць нешта, параіць і самае галоўнае — скаардынаваць нашу дзейнасць. У нас нядрэнны ў цэлым склад следчых органаў. Бываюць людзі і слабыя, і моцныя, але ў цэлым нядрэнны склад. Падрыхтаваныя, адказныя, сумленныя людзі. Калі вам давядзецца з кімсьці пазнаёміцца, вы ўбачыце, асабліва ў кіраўніцтве — моцныя хлопцы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што 12 верасня ў Беларусі будуць адзначаць Дзень супрацоўніка следчых органаў. Па словах Прэзідэнта, Аляксандр Бастрыкін як ніхто іншы разумее значнасць работы гэтага ведамства.

«Я хачэў бы вас павіншаваць. І ў асобе нашага старшыні, і ў асобах кіраўнікоў Беларусі і Расіі нашых хлопцаў, якія кожны дзень працуюць над раскрыццём злачынстваў, усё робяць для таго, каб сумленнасць перамагла», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што хоча падчас размовы паслухаць прапановы і заўвагі кіраўніка расійскага Следкама па многіх пытаннях.

«Акрамя іншага, вы ж яшчэ і вучоны чалавек, і буйны, вопытны кіраўнік. Прывітанне вам ад вашага начальніка (Уладзіміра Пуціна. — «**Зв.**»). Учора з ім да дзвюх гадзін ночы праблемы абмяркоўвалі. Потым кажу: «Паеду дамоў, бо Бастрыкін мяне чакае». «Як Бастрыкін?» — здзівіўся. Кажу: «Аляксандр у Мінску мяне чакае», — паведаміў кіраўнік краіны.

Паводле яго, перагаворы ў Крамлі былі добрыя, дамовіліся лідары пра многае.

«Гэта вельмі сур'ёзныя дамоўленасці. Такіх крокаў мы яшчэ не прадпрымалі, як за гэты тры гады падрыхтоўкі і выдачы гэтых саюзных праграм. Сёння (у пятніцу. — «**Зв.**») іх урады будуць абмяркоўваць у Мінску на пасяджэнні саюзнага Саўміна. Дзесьці 4 лістапада, у Дзень народнага адзінства ў Расіі, мы правядзём гэта мерапрыемства — Вышэйшы дзяржсавет», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён мяркуе, што на сустрэчы будуць канчаткова зацверджаныя ўсе 28 саюзных праграм.

«Трэба цэлы пласт перавярнуць заканадаўства, каб да гэтых дамоўленасцяў прыстасаваць унутранае заканадаўства, перапрацаваць нашы дзяржаўныя дагаворы. Яны таксама павінны адпавядаць нашым дамоўленасцям», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як дадаў кіраўнік краіны, на перагаворах у Маскве шмат увагі ўдзялілі пытанням бяспекі, дамовіліся, што будуць падтрымліваць узаемадзеянне і следчых органаў.

«Міжнародная абстаноўка да гэтага штурхае. Глядзіце, у Афганістане, на поўдні побач з Афганістанам, у Іраку, Сірыі, Лівіі, Ліване адбываюцца падзеі. Ідзе паток бежанцаў, наркотыкі захлістваюць Расію і Беларусь. Змагацца — следчым. Узрастае роля органаў следства, органаў папярэдняга дазнання. Будзем працаваць разам», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка скарыстаўся магчымасцю і падзякаваў расійскім органам бяспекі за дапамогу, выкананне просьбаў. Не адмаўляюць расіяне падзяліцца вопытам, ведамі, матэрыяльнай базай.

Аляксандр Бастрыкін адзначыў, што ў сумеснай рабоце следчых органаў з'яўляюцца новыя віды злачынстваў. «Экстрэмізм, тэрарызм, як і «афганскі сіндром», мы гэта ў Расіі ўжо адчуваем. Вы казалі ў адным з інтэрв'ю, што і Беларусь пачынае гэта адчуваць. Таму сёння мы будзем падпісваць новыя пратаколы аб супрацоўніцтве следчых камітэтаў у імя нашай агульнай перамогі на фронце барацьбы са злачыннасцю», — акцэнтаваў увагу кіраўнік расійскага Следчага камітэта.

***

Пасля сустрэчы на вышэйшым узроўні для дэлегацыі Следчага камітэта Расіі арганізавалі экскурсію па Палацы Незалежнасці. Сваімі ўражаннямі ад убачанага з журналістамі падзяліўся кіраўнік упраўлення вучэбнай і выхаваўчай работы СК Расіі Сяргей Пятроў.

«Палац вельмі ўражвае, мае свой каларыт. Вельмі прыемна тут знаходзіцца, урачыста, святочна, знакава», — адзначае госць.

Акцэнтаваў увагу Сяргей Пятроў і на сумеснай дзейнасці двух ведамстваў, напрацаванай за 10-годдзе існавання следчых камітэтаў у дзвюх краінах.

«Безумоўна, следчыя камітэты Расіі і Беларусі будуць сябраваць і далей. На рабочай сустрэчы нашы старшыні пра гэта выказаліся. І мы ўпэўненыя, што супрацоўніцтва будзе прадукцыйным. Па раскрыцці крымінальных спраў і па агульных узаемаадносінах у нас усё добра. Адзінае, што ўскладніла работу, — пандэмія», — сказаў супрацоўнік ведамства, адзначыўшы, што эпідэміялагічная абстаноўка паменшыла колькасць вочных кантактаў. Але гэта — часовая з'ява.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Акцэнты

# Важна чуць галасы з месцаў

### Старшыня Савета Рэспублікі правяла нараду з кіраўнікамі раёнаў

**У цэнтры ўвагі былі пытанні, звязаныя з сацыяльна-эканамічным развіццём рэгіёнаў.**



Фота БелТА.

Як патлумачыла на пачатку сустрэчы спікер верхняй палаты парламента, нагода для сённяшняга абмеркавання — магчымасць пачуць ацэнку прапанаваных змен, якія ініцыіруюць міністэрствы і ведамствы ў розныя нарматыўныя прававыя акты (законы, указы Прэзідэнта ці дэкрэты кіраўніка краіны) з пункту гледжання выканаўцаў. Наталля Качанава падкрэсліла, што наўмысна на нарадзе няма міністраў, бо ў дадзеным выпадку важна чуць меркаванні і галасы з месцаў, каб у далейшым мець абгрунтаванае рашэнне з улікам інтарэсаў мясцовай улады, якая далей рэалізуе нормы прынятых нарматыўна-прававых актаў:

— Гэта павінна быць абсалютна шчырая размова, дзе мне хацелася б пачуць ваша меркаванне: ці правільна будзе прымаць рашэнні, якія сёння прапануюць некаторыя міністэрствы, ведамствы, уносячы змены і дапаўненні ва ўказы Прэзідэнта, — падкрэсліла спікер Савета Рэспублікі.

Яна заклікала прадстаўнікоў раёнаў агучыць свой пункт гледжання, у тым ліку і альтэрнатыўны, бо заўсёды важна мець некалькі варыянтаў рашэння, бо гэта дае максімальна поўную карціну сітуацыі, каб у далейшым не атрымлівалася: нарматыўна-прававы акт прыняты, а яго рэалізацыя ўскладняецца пэўнымі нюансамі.

На сустрэчы быў абмеркаваны шэраг праектаў нарматыўных прававых актаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Саюзны ўрад

# ВАЖНЫ КРОК НАПЕРАД

### Савет Міністраў Беларусі і Расіі на пасяджэнні ў Мінску зацвердзіў 28 саюзных праграм

**Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА адзначыў, што гэтым зроблены вельмі важны крок да стварэння да 2024 года асноў функцыянавання адзінай эканамічнай прасторы ад Мінска да Уладзівастока.**

«Рэалізацыя гэтых праграм, на нашу думку, стане магутным імпульсам для нарошчвання аб'ёмаў узаемнага гандлю, развіцця сумесных вытворчасцяў і скаардынаваных мер падтрымкі нацыянальных вытворцаў. Закладзена база для правядзення ў найбліжэйшы час сумеснай ацэнкі эканамічных і палітычных рызык, каб прымаць на гэтай аснове своечасовыя меры ў адказ», — перадае словы прэм'ера Беларусі БелТА.

У энергетычнай сферы дасягнуты дамоўленасці аб паэтапным фарміраванні аб'ядналых рынкаў нафты, газу, электраэнергіі, што выраўнуе ўзровень выдаткаў на энергетыку для расійскіх і беларускіх кампаній. Таксама бакі дамовіліся і аб камфортнай цане, па якой прыродны газ будзе пастаўляцца ў Беларусь у наступным годзе.

«Паводле нашых ацэнак, толькі прамы эфект ад рэалізацыі інтэграцыйнага пакета для Беларусі прагназуецца ў росце ВУП прыкладна на $1 млрд, не лічачы дадатковыя магчымасці для беларускага бізнесу на расійскім рынку», — сцвярджае Раман Галоўчанка.

Ён акцэнтуе значнасць і сацыяльнага блока саюзных праграм: гарманізацыя падыходаў да пенсіённага забеспячэння, мер сацыяльнай абароны і падтрымкі асобных катэгорый грамадзян, укараненне адзіных прынцыпаў абароны правоў спажыўцоў.

Старшыня ўрада Расіі Міхаіл Мішусцін адзначыў, што саюзныя праграмы вызначаюць выразную траекторыю сумеснай працы практычна ва ўсіх сферах, у ліку якіх прамысловасць, фінансы, энергетыка, аграпрамысловы комплекс, падатковае і мытнае рэгуляванне, грашова-крэдытная палітыка. Яны датычацца транспартнага рынку, маркіроўкі тавараў, плацежных сістэм, ветэрынарнага і фітасанітарнага кантролю, абароны правоў спажыўцоў і ўніфікацыі заканадаўства ў працоўнай сферы.

Саўмін Саюзнай дзяржавы разлічвае на ўхваленне 28 праграм Вышэйшым дзяржсаветам, які плануецца на 4 лістапада.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Малдова абвясціла рэжым надзвычайнага становішча ў сферы аховы здароўя

**Улады Малдовы ўвялі рэжым надзвычайнага становішча ў галіне аховы здароўя ў сувязі з сітуацыяй з распаўсюджваннем каранавіруса ў краіне.**

Надзвычайнае становішча ў Малдове будзе дзейнічаць з 10 верасня да 30 кастрычніка. Рашэнне аб'явіла міністр аховы здароўя краіны Ала Немярэнка пасля пасяджэння Нацыянальнай надзвычайнай камісіі па грамадскім здароўі.

Так, пачынаючы з 11 верасня асобы, грамадзяне, старэйшыя за 18 гадоў, змогуць наведваць грамадскія мерапрыемствы толькі пры наяўнасці пэўных дакументаў: сертыфіката аб вакцынацыі, адмоўнага выніку тэста на каранавірус або тэста на антыцелы. Дапускаецца таксама даведка пра перанесенае захворванне на COVID-19 на працягу апошніх 90 дзён. Адзначаецца, што дакументы можна падаваць як у папяровым, так і ў электронным выглядзе.

Ала Немярэнка ўдакладніла, што ў найбліжэйшыя дні Міністэрства аховы здароўя Малдовы распрацуе план па прадухіленні распаўсюджвання інфекцыі COVID-19 і рэагаванні на яе.

### Будаўніцтва «Паўночнага патоку — 2» завяршылася



**Кіраўнік «Газпрама» Аляксей Мілер аб'явіў, што з раніцы 10 верасня ў 8:45 па маскоўскім часе будаўніцтва газаправода «Паўночны паток — 2» цалкам завершана. Пра гэта гаворыцца ў тэлеграм-канале кампаніі.**

6 верасня аператар будаўніцтва газаправода «Паўночны паток — 2» Nord Stream 2 AG праінфармаваў аб зварцы апошняй трубы ў Балтыйскім моры. 8 верасня Bloomberg са спасылкай на крыніцы паведамляла, што пастаўкі па «Паўночным патоку — 2» пачнуцца 1 кастрычніка. Дзве ніткі аб'екта ідуць у Германію па дне Балтыйскага мора. Даўжыня газаправода складае 1234 кіламетры пры прапускной здольнасці 55 мільярдаў кубаметраў у год.

### Аналітыкі назвалі расійскія рэгіёны, дзе пражываюць самыя багатыя людзі

**Масква і Падмаскоўе, Санкт-Пецярбург і Ленінградская вобласць сталі расійскімі рэгіёнамі, дзе пражывае больш за ўсё мільянераў, піша РБК са спасылкай на даследаванне аналітыкаў Цэнтра кіравання дабрабытам і філантропіі Маскоўскай школы кіравання «Сколкава».**

Паводле ацэнак экспертаў, у сталіцы і Маскоўскай вобласці пражывае каля 100 тысяч багатых людзей. У рэйтынг увайшлі таксама Санкт-Пецярбург і Ленінградская вобласць — 28 тысяч, Краснадарскі край — 12 тысяч, Растоўская вобласць — 6 тысяч і Татарстан — 5,5 тысячы.

Пры падліку ўлічвалася наяўнасць жылля коштам ад дзесяці мільёнаў рублёў, а таксама люксавыя аўтамабілі, якія трапляюць пад павышанае падаткаабкладанне. Раней кіраўнік камітэта Дзярждумы па фінансавым рынку Анатоль Аксакаў прапанаваў павысіць стаўку ПДФЛ для багатых да 35 %. Гэта, паводле яго слоў, дазволіць дзяржаве накіроўваць больш сродкаў на адрасную дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу.

# ВЫРАЗНА ФАРМУЛЯВАЦЬ СВАЮ ПАЗІЦЫЮ

**Падведзены вынікі рэспубліканскай акцыі «Беларусь адзіная»**

**Дыялогавы марафон пачаўся 20 жніўня ў Брэсце і закончыўся 8 верасня ў Мінску. За гэты час эксперты ў розных сферах грамадска-палітычнага жыцця аб'ехалі ўсе рэгіёны краіны і разам з палітычным актывам абмеркавалі важныя пытанні жыццядзейнасці краіны. У дыскусіях прыняло ўдзел больш за 2000 чалавек.**

**Вадзім ГІГІН, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ,** расказаў, што ініцыятыва форуму «Беларусь адзіная» была падтрымана Прэзідэнтам. «Форум выканаў адразу некалькі функцый. Мы падвялі вынікі тых бурных падзей, якія назіралі летам — восенню 2020 года. Акрамя таго, абмеркавалі новае свята — 17 верасня — не толькі ў кантэксце святкавання, але і ў сэнсе таго, што яно сімвалізуе і азначае. Безумоўна, шмат у чым гэта адкрыла новы палітычны цыкл. Наперадзе нас чакае фаза канстытуцыйнай рэформы, рэферэндум, і мы рыхтуемся да выбараў — як мясцовых, так і ў парламент. Увесь кангламерат актуальных пытанняў абмяркоўваўся падчас гэтых мерапрыемстваў», — расказаў Вадзім Гігін.

**Дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя» член Канстытуцыйнай камісіі Аляксандр ШПАКОЎСКІ** звярнуў увагу на тое, што падчас акцыі абмяркоўваліся пытанні, якія ўносяцца ў праект новай Канстытуцыі. У прыватнасці, камплектаванне і кампетэнцыі Усебеларускага народнага сходу, смяротнае пакаранне і правы працоўных калектываў на вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. «Па ўсіх гэтых пытаннях праведзены маніторынг меркавання палітычнага актыву нашай краіны. Гэта меркаванне будзе даложана членам Канстытуцыйнай камісіі, каб мы ўлічвалі яго для прыняцця рашэнняў. Пакуль магу сказаць, што пераважная большасць удзельнікаў форуму выступаюць за камплектаванне УНС не толькі з прадстаўнікоў дэпутацкага корпуса нашай краіны, але і за кошт іншых сацыяльна актыўных грамадзян Беларусі, якія будуць вылучаныя партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі і працоўнымі калектывамі», — паведаміў ён.

Рэспубліканскую акцыю «Беларусь адзіная» **эксперт Беларускага інстытута стратэгічных рашэнняў Аляксей АЎДОНІН** назваў унікальным мерапрыемствам. Звычайна дэлегаты з усіх рэгіёнаў ездзілі ў сталіцу на сустрэчы з экспертнай супольнасцю. У гэты раз было наадварот. Ён падкрэсліў, што ў рэгіёнаў свае погляды на тое, як працаваць ва ўмовах жорсткай санкцыйнай палітыкі, як выпрацоўваць рашэнне ў сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай сферах, як кіраваць прадпрыемствамі. Эксперт упэўнены, што хоць гэтыя погляды і маюць лакальны характар, але яны важныя для ўсёй краіны.

**Навуковы супрацоўнік «Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей ДЗЕРМАНТ** падчас правядзення акцыі адказваў за ідэалагічныя пытанні. Па яго словах, людзей у рэгіёнах турбуе не толькі эканоміка, а нацыянальная ідэя, традыцыйныя каштоўнасці, што вельмі добра і важна. «Сям'я, сацыяльны характар нашай дзяржавы — гэта падмурак, на якім грунтуецца ўся наша нацыянальная ідэнтычнасць. Тыя падзеі, якія мы перажылі за апошні год, кажуць аб карэкціроўцы нашага палітычнага курсу. І, вядома, гэта павінна адбівацца на ідэалагічнай рабоце ўнутры краіны. «Цяпер настаў час выразна фармуляваць сваю пазіцыю і даносіць да нашых людзей. Яны да гэтага гатовыя і будуць трансліраваць гэта далей», — упэўнены ён.

Важнасць сям'і і патрыятычнага выхавання ў фарміраванні нацыянальнай ідэі падкрэсліла і **кіраўнік цэнтра чалавечага развіцця і дэмаграфіі Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Настасся БАБРОВА.** Аб гэтым падчас форуму ішла гаворка ў кожным рэгіёне краіны. «Шматвектарная комплексная падтрымка сям'і можа называцца нацыянальным брэндам. І часта гучала пытанне: хто павінен выхоўваць патрыётаў? І гучаў пасыл, што тут нельга зацыклівацца на сям'і ці школе. Мы зрабілі вялікі крок у выбудоўванні сістэмы патрыятычнага выхавання. І я думаю, што за некалькі гадоў дасягнем поспеху», — адзначыла яна.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Захад-2021

# Выпрабаванне на зладжанасць

**За найбольш яркімі эпізодамі сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2021» карэспандэнты «Звязды» ўчора назіралі на палігоне «Брэсцкі»**



— Беларуска-расійскае вучэнне, як бы яго ні падавалі на Захадзе, з'яўляецца элементам падрыхтоўкі войскаў, — заявіў падчас урачыстага адкрыцця вучэння **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Віктар ГУЛЕВІЧ.** — Армія павінна рыхтавацца да абароны сваіх рубяжоў. Пры гэтым дасягненне зладжанасці сумесных дзеянняў ваеннаслужачых нашых краін — найбольш складанае пытанне арганізацыі ўзаемадзеяння, якое мы адпрацоўваем падчас вучэння.



Як перакананы першы намеснік міністра абароны, вучэнне прадэманструе высокую гатоўнасць армій нашых краін да сумесных дзеянняў па забеспячэнні суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці і незалежнасці Саюзнай дзяржавы. «Гэта стане своеасаблівым сігналам для калектыўнага Захаду ў бесперспектыўнасці размовы з пазіцыі сілы з народамі Беларусі, Расіі і Казахстана, а таксама іншых краін Арганізацыі дагавора калектыўнай бяспекі», — падкрэсліў Віктар Гулевіч.

Па легендзе аднаго з этапаў манеўраў, які адбыўся на палігоне «Брэсцкі», механізаваны батальён атакаваў перадавыя сілы праціўніка. Папярэдне правёўшы разведку, на арэне баявых дзеянняў з'явілася штурмавая авіяцыя — снарады трапілі ў цэль. Для таго каб праціўнік разгарнуў свае сілы, механізаваны батальён ажыццявіў стрэльбы. Адначасова ў атаку з умоўным праціўнікам уступілі артылерысты, мотастралкі, танкісты, лётчыкі. Увесь час у небе кружылі беспілотныя лятальныя апараты — за тым, што адбывалася на полі бою, вайскоўцамі ажыццяўляўся кантроль.

— Для нас гонар — адпрацоўваць задачы плячо ў плячо з нашымі братамі-расіянамі, адстойваць рубяжы нашай Радзімы, — адзначыў пасля ажыццяўлення задач **камандзір 6-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады гвардыі палкоўнік Аляксандр ЛАЎРЭНАЎ.** — Ваеннаслужачыя брыгады ўпэўнена прадэманстравалі свае навыкі, баявое майстэрства падчас вядзення абарончага бою. Усе задачы паспяхова былі выкананы. Умоўны вораг быў разбіты і пераможаны.

Як удакладніў камандзір брыгады, вайскоўцы ў тым ліку адпрацоўвалі новыя метады барацьбы з беспілотнымі лятальнымі апаратамі, вядзенне манеўранай абароны.

Для **камандзіра 1-й гаўбічнай самаходнай артылерыйскай батарэі старшага лейтэнанта Дзмітрыя КАРНІЛОВІЧА** гэта не першае вучэнне. Такое маштабнае — дэбютнае. «Для мяне сённяшні дзень як свята: я даўно марыў паўдзельнічаць у манеўрах, максімальна набліжаных да рэальных, — падзяліўся ваеннаслужачы. — З пастаўленымі задачамі мае падраздзяленне справілася на ацэнку «добра». Да манеўраў мы грунтоўна рыхтаваліся, таму нечаканасцяў не было».

Асаблівасцю вучэння з'яўляецца тое, што, акрамя беларусаў і расіян, у манеўрах прымаюць удзел і прадстаўнікі Узброеных Сіл Казахстана — такім чынам дэманструецца адзінства гатоўнасці да сумеснага выканання задач усімі краінамі АДКБ. Акрамя таго, «Захад-2021» адметны і тым, што ажыццяўляецца вялікая колькасць дэсантаў: тактычных, аператыўных — розных узроўняў і маштабаў. Адпрацоўваюцца вядзенне абарончых баёў, адыход войскаў, вядзенне манеўранай абароны, праводзіцца контрнаступленне ў інтарэсах аднаўлення тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі.

Нагадаем: падчас эпізодаў вучэння на нашай тэрыторыі ўдзельнічае каля 12,80 тысячы ваеннаслужачых: сярод іх 2,5 тысячы расійскіх і 50 вайскоўцаў з Казахстана. У манеўрах задзейнічана каля 350 адзінак бранятанкавай тэхнікі, да 110 адзінак артылерыі і рэактыўных сістэм залпавага агню, звыш 30 самалётаў і верталётаў.

**Вераніка КАНЮТА,**
**фота Аліны МАЗАВЕЦ,**
*Брэсцкая вобласць.*



# Найлепшыя традыцыі ў спадчыну маладым

**Беларускі саюз жанчын правёў першае пасяджэнне Савета старэйшын у музеі-галерэі «Янушкевічы», што ў аграгарадку Ракаў Валожынскага раёна.**

Новая структура заклікана прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў рабоце абласных, раённых, аб'яднаных, першасных арганізацый БСЖ ветэранаў жаночага руху. Вопытныя і моцныя духам жанчыны могуць перадаваць маладому пакаленню найлепшыя традыцыі ў грамадскай і дабрачыннай дзейнасці. Таксама каштоўныя іх думкі ў абмеркаванні найбольш актуальных праблем у грамадскім жыцці краіны.

«Месца выбрана невыпадкова, фактычна ў Ракаве праходзіла мяжа паміж заходняй і ўсходняй Беларуссю, — сказала **першы намеснік міністра аховы здароўя, старшыня Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН.** — Гэта месца сімвалічнае, бо тут пераклікаецца гісторыя, традыцыі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, што важна ў Год народнага адзінства. Мне хацелася б, каб група актыўных жанчын, якія былі ў саюзе з самага заснавання, якія шмат гадоў узначальвалі Беларускі саюз жанчын, абласныя, раённыя, гарадскія арганізацыі мелі магчымасць перадаць свой вопыт нашаму маладзёжнаму крылу».

Старшынёй Савета старэйшын абралі Надзею Ермакову, якая больш за пятнаццаць гадоў узначальвала БСЖ. Падчас пасяджэння абмеркавалі склад і зацвердзілі палажэнне Савета старэйшын. Не абышлося без прыемных сюрпрызаў: кожны член Савета старэйшын атрымаў з рук старшыні БСЖ прыгожы наручны гадзіннік.

Таксама Алена Богдан падзялілася з саветам добрай навінай: у ліпені арганізацыяй было сабрана 53 тысячы подпісаў беларускіх жанчын пад зваротам супраць санкцый, якія ўводзяць супраць нашай краіны. Зварот апублікаваны ў якасці афіцыйнага дакумента ААН на сайце арганізацыі.

«Хочацца, каб гэта паўплывала на рашэнне тых людзей і структур, якія ўводзілі санкцыі, — сказала Алена Богдан. — Мы хочам, каб наш голас пачулі».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# Груз дастаўлены на месцы

**3 панядзелка зноў можна прышчапіцца кітайскай вакцынай**

**Кітайская вакцына SARS-CoV-2 Vaccine (Vero Cell) перададзена ў рэгіёны Беларусі, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.**

Спецыялісты РУП «Белфармацыя» 9—10 верасня развезлі асноўную частку грузу ў вобласці. З панядзелка ўсе ахвотныя змогуць прайсці вакцынацыю. Вакцыну супраць COVID-19, якая прыбыла ў Беларусь, распрацавала фармкарпарацыя Sinopharm. У Брэсцкую вобласць перададзена каля 150 тыс. доз вакцыны, у Віцебскую — каля 125 тыс. доз, у Гомельскую — каля 155 тыс. доз, у Гродзенскую — 110 тыс. доз, у Мінскую — больш за 160 тыс. доз, у Магілёўскую — 110 тыс. доз, у Мінск — каля 200 тыс. доз.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Уладзіміру Уладзіміравічу Гацко ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**




# ПАВАЖАНЫЯ КАЛЕГІ!

***Віншую вас з Днём супрацоўніка органаў папярэдняга следства і 10-годдзем з дня ўтварэння Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь!***

Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што Следчы камітэт заняў годнае месца сярод дзяржаўных органаў сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. І ў гэтым наша агульная заслуга. Супрацоўнікі і грамадзянскі персанал даказалі, што дэвіз «Закон. Справядлівасць. Айчына» для нас не фармальны набор слоў, а прафесійны арыенцір.

Згуртаваны калектыў аднадумцаў, які складаецца з прафесіяналаў высокага класа і сапраўдных патрыётаў, адданых сваёй краіне і народу, — галоўная каштоўнасць нашага ведамства.

За непрацяглы перыяд існавання Следчага камітэта мы змаглі даказаць, што здольныя выканаць любыя пастаўленыя перад намі задачы, якасна рэалізаваць даручэнні кіраўніка беларускай дзяржавы.

Наш абавязак — у поўным аб'ёме забяспечыць абарону асобы і інтарэсаў краіны ад злачынных замахаў, канцэнтруючы намаганні на аператыўным і якасным расследаванні злачынстваў, пакрыцці шкоды і ліквідацыі іншых негатыўных наступстваў супрацьпраўных дзеянняў.

Сучасныя выклікі і пагрозы беларускаму грамадству вызначаюць прыярытэтныя напрамкі работы: разам з процідзеяннем злачыннасці і карупцыі, забеспячэннем эканамічнай бяспекі



гэта барацьба з тэрарыстычнымі і экстрэмісцкімі праявамі, абарона канстытуцыйнага ладу, захаванне тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту нашай дзяржавы.

Мы абавязаны максімальна эфектыўна, выразна і бескампрамісна выконваць ускладзеныя на нас задачы па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі, застаючыся вернымі Айчыне, абавязку і абранай прафесіі, падтрымліваючы на высокім узроўні службовую і працоўную дысцыпліну, удасканальваючы ўменні і навыкі.

Ад усёй душы жадаю вам, вашым родным і блізкім здароўя, шчасця і дабрабыту, мірнага неба над галавой! Хай выдатныя поспехі ў прафесійнай дзейнасці і ў далейшым суправаджаюць службу на карысць беларускага народа і дзяржавы!

**Старшыня Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь генерал-маёр юстыцыі Д. Ю. ГАРА.**

Кампетэнтна

# «За кожнай справай — лёс чалавека»

## Перш чым абвінаваціць кагосьці ў злачынстве, патрэбна сабраць вялікую доказную базу

**За плячыма ў намесніка начальніка следчага ўпраўлення — начальніка аддзела па расследаванні злачынстваў супраць інтарэсаў службы і парадку выканання воінскага абавязку ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці палкоўніка юстыцыі Алега ЦВІКЕВІЧА — дзясяткі расследаваных крымінальных спраў. За 21 год службы з якімі толькі злачынствамі ён ні сутыкаўся! Маладыя калегі сёння вучацца ў свайго старэйшага таварыша, звяртаючца да яго па дапамогу. Алег Леанідавіч нікому не адмаўляе: вопытны следчы лічыць, што ў сучасным свеце вучыцца на ўласных памылках ужо не актуальна.**



Фота Марыі ТРУШЫНСКАЙ.

Расследаванне адной з найбольш гучных спраў у практыцы следчага доўжылася практычна год. Супрацоўнікі Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС, дзе ён у той час працаваў, выйшлі на злачынную групоўку, якая займалася крадзяжом транспартных сродкаў у Расіі і ўвозам іх у Беларусь. У Верцялішках, што каля Гродна, на аўтамабілях мянялі нумары кузава і перапрадавалі іх у іншыя краіны.

— Асоба, якая добра валодала нямецкай мовай, знаходзіла ў інтэрнэце поўнасцю ідэнтычны аўтамабіль і пад рознымі падставамі прасіла ўладальнікаў выслаць яму дакументы на транспартны сродак, — згадвае дэталі справы Алег Цвікевіч. — Жыхары Германіі, якія нават не падазравалі, што хтосьці ў Беларусі стварае двайнікі іх жа аўтамабіляў, адгукаліся на просьбы. Члены злачыннай групы выраблялі на заводзе ў Гродне спецыяльныя таблічкі з нумарам кузава, якія потым уварвалі ў крадзеныя аўтамабілі, а затым па падробных дакументах перанакіроўвалі транспартныя сродкі за мяжу. Такім чынам, выкрадзены аўтамабіль станавіўся легалізаваным і паспяхова прадаваўся замежным аўтааматарам.

Каб раскрыць гэтае злачынства, следчымі была праведзена каласальная работа. Толькі па гродзенскіх эпізодах у суд былі накіраваны справы на 12 чалавек. Віну падазраваных удалося даказаць. Усе яны былі асуджаны.

Сёння палкоўнік юстыцыі ўзначальвае аддзел, які ў асноўным расследуе справы, звязаныя са злоўжываннем службовымі асобамі сваімі паўнамоцтвамі. Следчыя ажыццяўляюць праверкі і па фактах самазабойства ва Узброеных Сілах.

— Складанеі за ўсё ў нашай прафесіі прымаць рашэнне па крымінальнай справе: дастаткова ці не падстаў для прад'яўлення абвінавачвання, — гаворыць вопытны следчы. — Перад прыняццем такога важнага рашэння праводзіцца ацэнка ўсяга сабранага матэрыялу. За кожнай справай — лёс чалавека.

Профі

# У фокусе — нябачныя зладзеі

## На Гродзеншчыне паспяхова расследуюць справы, звязаныя з кіберзлачыннасцю

**Усё больш правапарушэнняў апошнім часам здзяйсняецца ў сферы інфармацыйных тэхналогій. І калі яшчэ некалькі гадоў таму большасць падобных злачынстваў раскрываць было цяжка, то цяпер следчыя дасягнулі пэўных поспехаў у расследаванні дадзенай катэгорыі крымінальных спраў, а таксама ва ўстанаўленні вінаўных асоб.**

### Крадзеж у сацсетцы

**Начальнік аддзела па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і незаконнага абароту наркотыкаў следчага ўпраўлення УСК Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці Ігар ЧАРНЯК** адзін з першых на Гродзеншчыне сутыкнуўся з падобнымі злачынцамі, якіх за руку не зловіш ды не заўсёды і ўбачыш. Расследаваць правапарушэнні ў сферы высокіх тэхналогій падпалкоўнік юстыцыі пачаў яшчэ да таго, як у 2011 годзе быў створаны Следчы камітэт.

— Першая такая справа была заведзена мною з прычыны несанкцыянаванага доступу да аднаго з інтэрнэт-рэсурсаў жыхара Гродзенскай вобласці, — успамінае следчы. — Не адразу, але падазраваная асоба была ўстаноўлена. Тады мала хто ведаў, як расследаваць падобныя злачынствы: ніякіх методык і алгарытмаў не існавала. Усё вывучалі самі, у тым ліку ў інтэрнэце. Звярталіся па вопыт да старэйшых таварышаў у Мінск.

У верасні 2016 года на фоне росту злачынстваў у сферы IT ва ўпраўленні Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці быў створаны асобны аддзел, які стаў устанаўліваць, а таксама прыцягваць да адказнасці кіберзлачынцаў, а таксама асоб, якія маюць дачыненне да распаўсюджвання наркотыкаў праз інтэрнэт. З кожным годам правапарушэнняў у IT-сферы станавілася больш, але не драмалі і следчыя. Сёння ў аддзеле служаць высакакласныя спецыялісты, якія хоць і не бачаць сваіх падазраваных у твар, але добра ведаюць, як іх вылічыць і прымусіць панесці пакаранне.

Некалькі гадоў таму, напрыклад, на слыху былі крадзяжы грашовых сродкаў пры дапамозе сацыяльнай сеткі «УКантакце». Ажыццяўляўся ўзлом персанальных старонак сацсеткі, і ад імя ўладальнікаў злачынцы пісалі віртуальным сябрам. Як правіла, у гэтых паведамленнях утрымліваліся просьбы падзяліцца рэквізітамі сваёй банкаўскай карты. І са ста чалавек абавязкова знаходзілася некалькі, хто перадаваў персанальныя даныя зламыснікам.

— Усяго пацярпелымі па гэтай справе было заяўлена звыш 230 чалавек у больш чым 300 эпізодах: гэта і ўзломы персанальных старонак, і блакіроўкі, і крадзяжы грашовых сродкаў амаль у ста чалавек, — згадвае дэталі гэтай справы Ігар Чарняк. — Была праведзена каласальная аналітычная работа сумесна з калегамі з упраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці УУС Гродзенскага аблвыканкама, у следчых падраздзяленнях краіны вывучаліся некаторыя нераскрытыя справы па аналагічных фактах злачынстваў, атрымлівалася інфармацыя ў рамках міжнародна-прававой дапамогі. Пазней устанавілі, што да гэтых правапарушэнняў мае адносіны адзін з жыхароў Брэсцкай вобласці. Яго віна ва ўсіх здзейсненых эпізодах злачынства была пацверджана сабранымі матэрыяламі крымінальнай справы. Матэрыяльную шкоду, якую абвінавачаны прынёс грамадзянам, ён кампенсаваў.

### Абараніце свае рахункі!

За апошнія тры гады злачынстваў ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у рэгіёне павялічыліся амаль у 10 разоў. Калі ў 2018 годзе было ўстаноўлена 300 правапарушэнняў у IT-сферы, у 2019-м — 930, то летась следчыя падраздзяленні вобласці расследавалі ўжо больш чым 2700 спраў, звыш 2460 з якіх звязаныя з крадзяжамі грашовых сродкаў з рахункавых картак грамадзян — менавіта яны складаюць аснову ўсіх злачынстваў у кіберпрасторы.

— Раней такія крымінальныя справы практычна не раскрываліся, бо грошы паступалі на рахункі прадстаўнікоў іншых дзяржаў, — удакладняе падпалкоўнік



Фота Марыі ТРУШЫНСКАЙ.

юстыцыі. — Мы праводзілі вялікую работу з праваахоўнымі органамі тых краін, але не заўсёды гэта было паспяхова: грошы пераводзіліся на рахункі падстаўных асоб, а вінаўныя, якія знаходзіліся за межамі краіны, выкарыстоўвалі схемы забеспячэння ананімнасці ў сетцы інтэрнэт. Апошнім часам непасрэднымі ўдзельнікамі злачынных груповак сталі выступаюць жыхары Беларусі, адказныя за арганізацыю вываду скрадзеных грашовых сродкаў праз падстаўных людзей. У шэрагу выпадкаў яны самі распрацоўваюць схемы крадзяжоў, непасрэдна ўдзельнічаюць у супрацьпраўных дзеяннях. Цяпер мы навучыліся выяўляць пасрэднікаў у гэтых крымінальных справах, якія з'яўляюцца нашымі грамадзянамі. У Следчым камітэце запушчана і паспяхова выкарыстоўваецца сістэма аналізу ідэнтыфікатараў, якая дазваляе, не выходзячы з кабінета, адсачыць злачынствы серыйнага характару, зарэгістраваныя на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Колькасць званкоў, падчас якіх людзі давалі незнаёмцам рэквізіты сваіх банкаўскіх рахункаў, дзякуючы комплекснай прафілактычнай рабоце, на шчасце, удалося знізіць. Але, нягледзячы на тое што ўжо ледзь не з кожнага праса праваахоўныя органы папярэджваюць грамадзян нікому не паведамляць гэтую канфідэнцыяльную інфармацыю, следчым работы хапае — кіберзлачынцы прыдумляюць усё новыя спосабы вымання матэрыяльных сродкаў. Апошнім часам яны называюцца ўжо не супрацоўнікамі банкаў, а прадстаўнікамі праваахоўных органаў.

### Гучная справа

Гродзенскія следчыя ў тым ліку расследуюць справу, звязаную з крадзяжом грашовых сродкаў у людзей, якія планавалі арандаваць кватэру і траплялі на фэйкавыя аб'явы, размешчаныя ў інтэрнэце. Зламыснікі прапаноўвалі патэнцыйным кватэраздымшчыкам перавесці перадаплату на пэўны рахунак і завалодвалі чужымі грашыма. Затым прасілі ў тых, хто ўжо пералічыў грошы, рэквізіты банкаўскай карты, каб вярнуць перадаплату (маўляў, потым заплаціце ўсю суму). Аднак рахунак у людзей не папаўняўся, а, наадварот, з яго спісваліся ўсе сродкі. Колькасць новых эпізодаў злачыннай дзейнасці абвінавачаных расце з кожным днём.

Паспяхова следчыя аддзела некалькі гадоў таму завяршылі расследаванне і заблытанай крымінальнай справы. У міліцыю звярнуліся прадстаўнікі аднаго з айчынных банкаў, які вымушаны быў выплаціць больш чым 40 тысяч долараў замежным банкам за махлярскія расходныя аперацыі з картачных рахункаў іншаземцаў, праведзеныя ў адным з гродзенскіх казіно. Супрацоўнікі гульнявой установы разводзілі рукамі: маўляў, мы не маем да гэтых крадзяжоў ніякага дачынення. Грамадзянін Расіі на працягу паўтара тыдня наведваў казіно, разлічваючыся за набыццё гульнявых фішак пластыкавымі картамі. Гэта не выклікала ў касіра падазрэнняў. Дзе шукаць расіяніна, ніхто не ведаў.

Следчым аддзела трэба было разблытаць хітрую афёру, якую ажыццявілі дырэктар, уладальнікі і некаторыя супрацоўнікі казіно. Як высветлілася, той, хто набываў гульнявыя фішкі, быў падстаўным гульцом у распрацаванай зламыснікамі схеме. Сутнасць злачынства заключалася ў крадзяжы грашовых сродкаў з кампраметаваных банкаўскіх рахункаў, якія прапаноўваліся для продажу ў ценявой частцы інтэрнэту.

Поспех у справе

# СЛЕДЧЫ — УНІКАЛЬНЫ СПЕЦЫЯЛІСТ

## Што падштурхоўвае людзей на парушэнне закона і як заканадаўству «паспець» за злачынцамі?

**Следчыя Шчучынскага раёна — на Гродзеншчыне людзі вядомыя. Найперш, сваёй рэпутацыяй. Яны з лёгкасцю выходзяць на след злачынцаў, разблытваюць складаныя шматэпізодныя крымінальныя справы, даюць справядлівую ацэнку кожнай падзеі, калі яна патрабуе іх умяшання. У праваахоўнікаў практычна не бывае нераскрытых спраў. Невыпадкова на працягу некалькіх гадоў Шчучынскі раённы аддзел Следчага камітэта стаға навіўся найлепшым следчым падраздзяленнем краіны.**

Каб даведацца, у чым сакрэт поспеху, напярэдадні 10-годдзя сілавога ведамства карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з **начальнікам Шчучынскага раённага аддзела Следчага камітэта палкоўнікам юстыцыі Аляксандрам КІЗІЛЕВІЧАМ.**

***— Аляксандр Янавіч, хто гэтыя людзі, якія два разы за дзесяцігадовую гісторыю існавання Следчага камітэта становіліся найлепшымі ў краіне?***

— У нашым аддзеле разам са мной працуе 15 следчых і два мае намеснікі. Нядаўна прыйшлі двое маладых супрацоўнікаў: адзін з іх скончыў следча-экспертны факультэт Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў. Гэта згуртаваны калектыў, дзе адзін за аднаго гарой. Поспех у нашай рабоце залежыць выключна ад гэтых людзей. Следчыя маюць каласальны вопыт, усё жыццё яны працавалі ў гэтым раёне. Знаёмыя з мясцовымі жыхарамі, ведаюць падыход да кожнага. Як правіла, мы маем справу з аднымі і тымі ж людзьмі: большасць злачынцаў атрымлівае паўторныя судзімасці. Ад іх нават даводзілася чуць, што следчым Шчучыншчыны можна даверацца. Таму ніхто ад нашых супрацоўнікаў не бегае. Аб гэтым сведчыць хоць бы той факт, што колькасць падазраваных асоб, якія знаходзяцца ў вышуку, у нас мінімальная.

***— Вы ўзначальваеце аддзел са снежня 2014 года. Ваша прызначэнне супала з перыядам станаўлення ведамства. Ці шмат памянялася з таго часу?***



— Вялікую лепту ў станаўленне сілавога ведамства ўнёс былы старшыня Следчага камітэта Іван Данілавіч Наскевіч, які добра разумеў, як нам трэба працаваць. Пры гэтым глабальных змен у нашай рабоце не адбылося. Па-ранейшаму нашы галоўныя дакументы, своеасаблівыя арыенціры ў прафесійнай дзейнасці — Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы. Сёння мы ўжо паўнавартасная структура, якая мае пэўны вопыт. 10 гадоў — гэта ўжо не немаўля. Мы ўпэўнена стаім на нагах. Расследуем шматэпізодныя крымінальныя справы, удзельнічаем у стварэнні і дапрацоўцы нарматыўных актаў заканадаўства. За гэты час унесена нямала змен. Мы ўжо не адцягваем увагу на іншыя мерапрыемствы — на тую ж ахову правапарадку. Памяняліся падыходы і ў рабоце. Калі на месца выязджае следча-аператыўная група, ужо следчы вырашае, у якім кірунку будзем працаваць, менавіта наш чалавек акрэслівае і перспектыву канкрэтных следчых мерапрыемстваў. Раней мы знаходзіліся ў падначаленні органаў унутраных спраў, таму не ўсе нашы рашэнні былі такімі, як мы хацелі.

***— Тым не менш узаемадзеянне з іншымі праваахоўнымі органамі наладжана...***

— Яно нікуды не дзенецца, бо мы робім адну і тую ж работу. Узаемадзеянне нават стала яшчэ больш моцным. Мы прыслухоўваемся адзін да аднаго, размяркоўваем, хто чым павінен займацца. Адна галава — добра, а дзве лепш. У Шчучынскім раёне ўзаемадзеянне праваных структур наладжана на самым высокім узроўні. Аказваем адзін аднаму садзейнічанне, дапамагаем — як парадай, так і на справе. І кожны зробіць больш, чым ад яго першапачаткова патрабавалася.

***— Вы сказалі аб тым, што ў кампетэнцыі ведамства — удзельнічаць і ў заканадаўчым працэсе. Ці часта ўзнікае такая неабходнасць?***

— Свет не стаіць на месцы. Часам мы не паспяваем за тым, як мяняюцца спосабы і формы злачыннасці. Узяць хоць бы крадзяжы з дапамогай камп'ютарнай тэхнікі: сёння ў злачынцаў адна схема выкрадання грашовых сродкаў, заўтра — іншая. У свой час быў вельмі неабходны дэкрэт Прэзідэнта № 6 «Аб неадкладных мерах па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў». Сітуацыя была настолькі вострай, таму, каб злачынствы ў гэтай сферы пайшлі на спад, трэба было дзейнічаць хутка і жорстка — у выніку ў заканадаўства аператыўна быў унесены пералік усіх наркатычных сродкаў, а таксама іх аналагаў. Сёння зладзеі ўсё часцей здзяйсняюць правапарушэнні ў інтэлектуальнай сферы: павялічваецца колькасць эканамічных злачынстваў, у гаіне высокіх тэхналогій. І тут таксама заканадаўства патрабуе ўдасканалення.

***— Па якіх злачынствах часцей за ўсё даводзіцца заводзіць крымінальныя справы?***

— Большасць злачынстваў здзяйсняюцца з карыслівых мэт. Людзі ва ўсе часы хочуць атрымаць выгаду. Гэтае жаданне і падштурхоўвае іх на парушэнне закона. У асноўным мы займаемся расследаваннем крадзяжоў і ўсіх маёмасных злачынстваў. Ёсць і забойствы (на шчасце, у нашым рэгіёне іх няшмат), іншыя правапарушэнні, у тым ліку здзейсненыя ненаўмысна.

***— А ці спраўляюцца з такім аб'ёмам работы вашы супрацоўнікі?***

— Спраўляюцца, аднак кадравае пытанне заўсёды ў прыярытэце. Следчы — штучны спецыяліст. Нельга ўзяць чалавека з вуліцы і даручыць яму выконваць нашы абавязкі. Часам і тыя, хто мае адпаведную спецыяльнасць і кваліфікацыю, не вытрымліваюць нагрузкі. Не кожны можа працаваць следчым. Тут патрэбны аналітычны і гнуткі розум, шырокі светапогляд, высокі інтэлект. Немалаважная ўседлівасць. Халерыкам вельмі складана працаваць у нас, бо шмат часу патрабуе складанне працэсуальных дакументаў. Следчы — гэта не герой кінастужкі: прыйшоў, убачыў, перамог. У асноўным мы занятыя карпатлівай, аналітычнай работай. Прыкладна 40 % нашай працы — перанос інфармацыі на электронны і папяровы носьбіты. Мы выпускаем штучны высокаінтэлектуальны прадукт, які называецца крымінальнай справай.

***— А яшчэ ў следчага ненармаваны працоўны дзень, часам трэба працаваць без выхадных...***

— І гэта часта залежыць ад нашых «работадаўцаў», як я называю падазраваных. Ты запланаваў на сёння следчае дзеянне, а чалавек не прыйшоў. Людзі розныя бываюць. Адны адразу ідуць на кантакт, хтосьці наўмысна цягне час, робячы выгляд, што не разумее, што ад яго хочуць.

***— Як правіла, следчыя — улюбёныя ў сваю справу людзі. А як пачынаўся ваш шлях у прафесію?***

— Пасля тэрміновай службы ў войску я паступіў у Беларускі інстытут правазнаўства. Вучыўся завочна, працаваў міліцыянерам-кانваірам, а затым у ізалятары часовага знаходжання Ленінскага РАУС горада Гродна. У маі 2000 года мяне, яшчэ старшага сяржанта, прызначылі следчым. Следства Ленінскага РАУС у свой час з'яўлялася кузняй кадраў: многія аўтарытэтныя спецыялісты, кіраўнікі ведамасных падраздзяленняў Гродзеншчыны пачыналі сваю прафесійную дзейнасць менавіта там. У 2011 годзе я стаў намеснікам начальніка Слонімскага РАУС. Затым служыў следчым па асабліва важных справах Ленінскага раённага аддзела Следчага камітэта ў Гродне, намеснікам начальніка Гродзенскага міжраённага Следчага камітэта. Са снежня 2014 года я ўзначальваю Шчучынскі аддзел, аб чым ні колькі не шкадую. Тут працуюць людзі, якія не хочуць мяне падвесці. А я, у сваю чаргу, у адказе за іх.

На сваім месцы

# АДНА ПРАФЕСІЯ НА ДВАІХ, або Следства вядуць муж і жонка

**Калектыў у Шчучынскім раённым аддзеле Следчага камітэта невялікі. Аднак усе — ад начальніка да падначаленага — як адна сям'я. Працуе тут і сапраўдная сямейная пара — Іван і Вольга СТУПАКЕВІЧЫ.**

Аб прафесіі праваахоўніка Іван задумваўся яшчэ ў дзяцінстве. Невыпадкова, калі пасля арміі трэба было вызначацца з прафесіяй, ён паступіў у Магілёўскую школу міліцыі. Пасля яе заканчэння прыйшоў працаваць у шчучынскую міліцыю. Рэгіён для Івана знаёмы: нарадзіўся і вырас маёр юстыцыі на станцыі Ражанка, што непадалёк ад райцэнтра. У Шчучынскім раённым аддзеле Следчага камітэта малады чалавек служыць з першых дзён утварэння сілавога ведамства.

У адрозненне ад галавы сям'і, Вольга Ступакевіч следчым працуе нядаўна. Аднак насіць пагоны яна марыла з дзяцінства. Пасля заканчэння юрыдычнага факультэта Мінскага дзяржаўнага гандлёвага каледжа ў Мінску працавала ў сталічнай міліцыі, у ахове Мінскага метрапалітэна. Акурат перад гэтым у метро адбыўся выбух.

— Складаны быў час, — успамінае Вольга Ступакевіч. — Працавалі без адпачынку і часта нават без сну.

Сёння ў лейтэнанта юстыцыі таксама здараюцца бяссонныя ночы — растуць дзеці, часам не спіцца з-за таго, што не ўдаецца так хутка, як хочацца, расследаваць злачынствы. Праўда, за час працы следчым нераскрытых спраў у Вольгі яшчэ не было.

Вядома, кансультуецца Вольга Ступакевіч і ў мужа — усё ж такі ў Івана ўжо амаль 20-гадовы вопыт службы ў праваахоўных органах. Яны пазнаёміліся, калі Іван прыйшоў на папярэднюю месца працы Вольгі: следчаму трэба было дапытаць яе калегу, а таксама саму дзяўчыну. Ён нават не мог прадбачыць, што дзякуючы прафесіі сустрэне сваю палавінку. Вольга яму настолькі спадабалася, што прайшоў усяго месяц пасля знаёмства, як Іван прапанаваў дзяўчыне выйсці за яго замуж. З таго часу яны разам і дома, і на рабоце. У маладых людзей расце двое дзетак.



Фота Марыі ТРУШЫНСКАЙ.

— У мяне часта пытаюцца, як можна працаваць разам з мужам, — гаворыць Вольга Ступакевіч. — Я заўсёды адказваю так: калі б дрэнныя адносіны былі дома, то, напэўна, не варта было б і разам працаваць. Мы заўжды разам: у нас аднолькавы погляд на жыццё, агульныя інтарэсы. Мы не напружваем адзін аднаго, а, наадварот, калі неабходна, дапамагаем.

Іван Ступакевіч папярэджваў жонку, што працаваць следчым можа не кожны. «Я ж гляджу, ён спраўляецца — чаму ў мяне не атрымаецца?» — удакладняе Вольга. — Цяпер ён для мяне падтрымка і апора ва ўсіх планах. Калі шчыра, грамадзянская праца не маё. Я, напэўна, нарадзілася, каб насіць пагоны».

Няма таго следчага, які б не памятаў сваю першую справу. Не выключэнне — і Іван Ступакевіч. Гэта была «хуліганка». У рэстаране разбілі шкло. Зламыснніка ўстанавілі па гарачых слядах. У Вольгі ж першае расследаванне было больш складаным. Мужчыну, які ўлез у жылы дом і ажыццявіў некалькі крадзяжоў, шукалі не адзін дзень. Складанасць заключалася ў тым, што Вольга на практыцы сутыкнулася з шэрагам следчых дзеянняў, якія патрабавалі аператыўнасці. У выніку злодзея затрымалі, першая справа маладога следчага была паспяхова раскрыта.

— За якое расследаванне ні бралася б, заўсёды спрабую быць аптымістычна настроенай, — дзеліцца прафесійнымі хітрыкамі лейтэнант юстыцыі. — Да кожнага падазраванага стаўлюся аднолькава: няважна, займаў ён кіруючую пасаду ці ўсё жыццё выпіваў. Кожны чалавек — у першую чаргу асоба, і ты не ведаеш, што падштурхнула яго да здзяйснення злачынства. Любую справу, кожны чалавечы лёс я прапускаю праз сябе. Разумею, што гэта не зусім правільна, але нічога з сабой зрабіць не магу.

Іван менш эмацыянальны, чым жонка. «Чалавек, які здзейсніў злачынства, павінен панесці за гэта пакаранне, — перакананы маёр юстыцыі. — Ён жа не перажывае, калі ідзе на крадзеж, забойства ці іншае правапарушэнне. Не думае і аб чалавеку, якому сваімі дзеяннямі наносіць маральную, матэрыяльную або фізічную шкоду. Ніколі нельга займаць ні бок злачынцы, ні бок пацярпелага. Ад нашага расследавання залежыць лёс чалавека. Спрабуеш з усіх бакоў вывучыць крымінальную справу, каб даць максімальна праўдзівую ацэнку яго дзеянню. Следчы — чалавек з павышаным пачуццём аб'ектыўнасці, які збірае інфармацыю і вызначае, хто пацярпелы, а хто вінаваты. Адна справа — знайсці злачынцу, другая — даказаць яго віну».

Вядома, Іван Ступакевіч, як, напэўна, і кожны следчы, перажывае, калі не раскрываюцца справы. «У любым выпадку, трэба максімальна выканаць сваю работу, каб потым не было сорамна, што ты нечага не зрабіў», — перакананы старшы следчы.

**Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

Разам мы — моцныя

# «НАМ ТРЭБА ВЫРАШЫЦЬ, ЯКОЙ МЫ БУДЗЕМ БУДАВАЦЬ БЕЛАРУСЬ»

**Каля 600 чалавек, сярод якіх народныя выбраннікі, ідэалагічныя работнікі, прафсаюзныя актывісты, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, прынялі ўдзел у рэгіянальным форуме «Беларусь адзіная», апошні этап якога прайшоў у Мінску 8 верасня. У якасці экспертаў выступілі вядомыя беларускія палітолагі, сацыёлагі, эканамісты Вадзім Гігін, Аляксандр Шпакоўскі, Аляксей Дзермант, Анастасія Баброва, Аляксей Аўдонін. Гэта была актуальная, цікавая, часам вострая размова з аўдыторыяй.**

— Гэты праект запусцілі ў вытворчасць даўно, — распавядае Іван Паўлаў. — Мы доўга працавалі над сцэнарыем. Тэма маладых людзей, якія ў 1945 годзе размініравалі Мінск пасля вайны, мякка кажучы, не вельмі шырока вядома грамадству. Мы знайшлі звесткі, што пад сцягам «Осоавиахим» (**Заўв.** — Таварыства садзейнічання абароне, авіяцыйнаму і хімічнаму будаўніцтву СССР), які ў 1947-м стаў ДТСААФ, моладзі прапаноўвалі стаць размінёрамі. Менавіта такое слова: «размінёры». Яны не былі сапёрамі, якія і мініруюць, і размініруюць. У разбураным Мінску засталося шмат боепрыпасаў, якія не разарваліся, іх належала тэрмінова абясшкодзіць. І аб тых 16-гадовых хлопцах і дзяўчатах, якія гэта рабілі, мы захацелі распавесці. У эпізодах сучаснасці мы расказваем аб рабоце супрацьміннага цэнтра, які знаходзіцца ў нас пад Мінскам. За адзін тыдзень дастаюць па 200-300 неабясшкоджаных боепрыпасаў. Я нават даведаўся, што сама зямля за год выштурхоўвае прадметы на адзін сантыметр. Мы проста гэтага не бачым: кожны дзень ездзім на работу, ходзім у крамы, а людзі рызыкуюць пастаянна — што 80 гадоў таму, што сёлета. А вы паглядзіце: знасілі стары ВДНГ — знайшлі неабясшкоджаную бомбу. У раёне Аэрадромнай, калі будавалі новы раён, знайшлі дзве авіябомбы. Гэта рэха вайны, якое цягнецца праз час.

Рэжысёр адзначыў, што ў будучым фільме знойдзецца месца і каханню:

— Вядома ж, на фоне ваеннай тэматыкі ў нас будуць разгортвацца і чалавечыя ўзаемаадносіны. Увогуле, у сусветнай драматургіі існуе 36 сюжэтаў, больш выдумаць ніхто не зможа. Таму ў нас ёсць і пра каханне, і пра здраду, і пра ўчынкі.

Рабіць высновы пакуль рана — праект зроблены толькі напалову. Але з таго, што мы паспелі ўбачыць і пачуць, падаецца, што нас чакае стужка сацыяльная накірунку. Прыемна, што ў фільме ёсць сувязь менавіта з беларускай рэчаіснасцю. Асабліва такой, якая не ляжыць на паверхні. Спадзяёмся, што Іван Паўлаў пакажа ваенную тэму з новага ракурсу.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота БелТА.**

# І ЦІКАВЫХ ГІСТОРЫЙ

«Для пабудовы дома знайшлі ўчастак, які ўяўляў сабой сад, пасаджаны хутчэй за ўсё ў канцы мінулага стагоддзя. Участак знаходзіўся ў пачатку 2-га Шпітальнага завулка (пазней Вайсковага) пры ўваходзе ў гарадскі парк, які тады насіў назву — імя Прафінтэрна. Пасля вайны месца сядзібы ўвайшло ў тэрыторыю парку імя Горкага».

І вось у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа вырашылі стварыць трохмерную мадэль сядзібы Песняра і змясціць яе ў атмасферу гарадскога асяроддзя 20—30-х гадоў XX стагоддзя. За аснову ўзялі архіўна-бібліяграфічныя звесткі, матэрыялы з фондаў музея, а таксама ўспаміны сям'і Міцкевічаў.

— Ідэя ўзнікла ў нас больш чым год таму. Яна нарадзілася ў тагачаснага дырэктара музея Аляксандра Васілевіча Храмога. Абмеркавалі яе, а пасля запрасілі далучыцца да працы Ахрэма Белабровіка, найвыдатнейшага вэб-дызайнера. Ён некалі супрацоўнічаў з музеямі ў праекце 3D-мадэляў беларускіх замкаў. І мы пайшлі на здзяйсненне такой ідэі, для таго каб ажывіць нашу экспазіцыю, — дзеліцца **вучоны сакратар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Антон АСТАПОВІЧ.** — Мы ведалі, што некалі ў экспазіцыі знаходзіўся макет дома, у якім Колас жыў з 1921 да 1927 года. Але гэты макет прыйшоў у дрэнны стан, і тады яго адрэстаўрыравалі, зрабіўшы механізаваным. Цяпер ён дазваляе ўбачыць, як выглядаў дом знутры. І паралельна, паколькі цяпер у музеях прымяняюцца самыя розныя мультымедыйныя прыстасаванні, мы пачалі распрацоўваць 3D-мадэль дома, у якім Якуб Колас жыў з 1927 да 1941 года.

Аднак ад ідэі зрабіць проста 3D-рэканструкцыю будынка стваральнікі праекта адмовіліся. Перш за ўсё таму, што калі інфармацыі пра знешні выгляд было ў прынцыпе дастаткова, то пра ўнутраныя інтэр'еры звесткі захаваліся толькі фрагментарна. Пайшлі іншым шляхам і пачалі працаваць над рэканструкцыяй гарадскога асяродка таго перыяду, дзе тады гэты дом знаходзіўся. Да работы далучыўся амаль што ўвесь калектыў. У прыватнасці, мой суразмоўца займаўся архіўна-бібліяграфічнымі вышукамі, а пасля да працэсу далучылі яшчэ і Паўла Растоўцава, якога ведаюць у тым ліку і як цудоўнага знаўцу Мінска. Так агульнымі сіламі аднаўлялі інфармацыю пра тагачасны ландшафт, рэльеф, забудову... Па апошняй якраз было мінімальна звестак, таму вырашылі драўляную забудову рэканструяваць па аналагах.

— Былі прадстаўлены цэлы шэраг праектаў драўляных дамоў Мінска канца XIX — пачатку XX стагоддзя, цэлы шэраг фотаздымкаў, і менавіта па гэтых аналагах драўляная забудова і аднаўлялася. Гэта не стапрацэнтна дакладная рэканструкцыя самой забудовы — гэта такі гіпатэтычны падыход па аналагах. І ў выніку атрымаўся найцудоўнейшы праект, — кажа Антон Уладзіміравіч. — Ён прайшоў у сваім развіцці некалькі этапаў. Напрыклад, калі мы сумесна з гістарычным музеем на іх плошчах рабілі выстаўку, прысвечаную 80-годдзю пачатку вайны, то ролік быў значна пашыраны. І ў яго ўвайшоў ужо менавіта той кавалак Мінска (вуліца Савецкая, лінія сучаснага праспекта), куды пазней і ўпісалі дом пісьменніка. Вядома, што ён быў драўляны, двухпавярховы. Акрамя гэтага, быў размешчаны цудоўны фотаздымак — на ім сярэдні сын Якуба Коласа Юрка Міцкевіч (здымак трыццатых гадоў XX стагоддзя), і гэта сімвал, бо Юрка пайшоў на фронт і прапаў без вестак. Тут можна паглядзець і на першы аўтамабіль пісьменніка. І ўсе гэтыя дэталькі ствараюць вельмі добрую атмасферу. Ведаеце, у нас ёсць трэйлер, зроблены з эфектам, быццам гэта кінахроніка таго часу. Калі я яго апублікаваў у сацыяльнай сетцы і жартоўна адзначыў, што знойдзена кінахроніка, якая алічбоўваецца ў музеі, то ў каментарыях некаторыя гэта ўспрынялі за праўду — настолькі ўдалая імітацыя ў нас атрымалася. Спадзяёмся, што гэты праект будзе карыстацца папулярнасцю і дадасць новых уражанняў нашым наведвальнікам.

Відэаролік стане часткай пастаяннай экспазіцыі пра беларускага класіка, якую супрацоўнікі музея збіраюцца абнавіць да юбілею, які адзначым у наступным годзе. Аднак ужо зараз у самых цікаўных і адданых прыхільнікаў творчасці Якуба Коласа ёсць магчымасць азнаёміцца з вынікам працы, якая ўносіць новыя эмоцыі ў аповед пра яго жыццё.

**Алена ДРАПКО,**
**фота аўтара.**

# ТЭХНІЧНАЯ ЭЛІТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння ў сістэме прафесійнай адукацыі ў нас прадугледжаны розныя траекторыі навучання, але, самае галоўнае, сярод іх няма тупіковых. Перад маладымі людзьмі адкрыты ўсе ўзроўні адукацыі, што забяспечвае ім устойлівае становішча на рынку працы. І зусім неабавязкова пачынаць прафесійны шлях з навучання ў ВНУ. Мы заўважылі, што абітурыентаў цікавяць прафесіі, якія маюць перспектыву развіцця ў рэальным сектары эканомікі. Прычым значэнне мае ўсё: і прыцягальнасць назвы, і змест падрыхтоўкі, і наяўнасць сучаснага адукацыйнага асяроддзя, якое дазваляе сфарміраваць адпаведныя кампетэнцыі, і кваліфікацыя педагогаў (ці здольныя яны зрабіць працэс навучання захапляльным).



## Тэхнік-біятэхнолаг

Установы прафесійнай адукацыі працуюць у вельмі шчыльнай звязцы з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў і аператыўна абнаўляюць кваліфікацыі.

«Галоўнае — адпавядаць тэндэнцыям не толькі сённяшняга дня, але і ўяўляць, якія прафесіі будуць запатрабаваныя ў перспектыве, што трэба сёння вывучаць, каб адпавядаць патрабаванням рынку працы на тры-чатыры гады наперад. Без гэтага сістэма прафесійнай адукацыі не зможа задаволіць патрабаванні, якія прад'яўляюць заказчыкі кадраў, — разважае **начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА.** — Дыяпазон спецыяльнасцяў у нас дастаткова шырокі: 105 на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай і каля 190 — на ўзроўні сярэдняй спецыяль-

**«Прадпрыемствы ўкаранялі тэхналогіі, якія прыйшлі да іх з адукацыі».**

най. Мы імкнёмся максімальна наблізіцца да патрабаванняў, якія дыктуе рынак працы: як у колькасным, так і ў якасным плане. Таму ў адных установах нейкія спецыяльнасці часова закрываюцца, затое адкрываюцца новыя, на выпускнікоў якіх ёсць попыт».

Напрыклад, у 2019 годзе ў філіяле РІПА «Маладзечанскі політэхнічны каледж» распачалася падрыхтоўка па новай спецыяльнасці «Вытворчасць біятэхналагічнай прадукцыі» з прысваеннем кваліфікацыі «Тэхнік-біятэхнолаг».

— Мы актыўна супрацоўнічаем з рэзідэнтам індустрыяльнага парка «Вялікі камень» — Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыяй. Высокатэхналагічныя вытворчасці толькі адкрываюцца, а мы ўжо рыхтуем для іх кадры. Гэта сведчыць аб тым, што сістэма прафесійнай адукацыі развіваецца сінхронна, а недзе і апярэджваючы патрэбы эканомікі, — падкрэслівае Валерый Галубоўскі. — Праз два гады мы канстатуем, што цікавасць з боку маладых людзей да новай спецыяльнасці ёсць, пра што сведчаць і конкурсы падчас прыёмнай кампаніі. Моладзь бачыць, што заказчык гатовы даць сучасныя працоўныя месцы і забяспечыць адпаведны сацыяльны пакет для маладых спецыялістаў.

Яшчэ адна новая спецыяльнасць — «Арганізацыя тэхнічнага сэрвісу транспартных сродкаў». Будзем рыхтаваць спецыялістаў, здольных эксплуатаваць і рамантаваць электрамабілі. Попыт на такія кадры высокі, асабліва ў сувязі з шырокім укараненнем сеткі электразапраўачных станцый і ростам папулярнасці гэтага экалагічна чыстага віду транспарту. Створана і матэрыяльна-тэхнічная база для падрыхтоўкі навучэнцаў — рэсурсны цэнтр у філіяле РІПА «Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж імя акадэміка М. С. Высоцкага».

## Рабочы і інжынер

У многіх краінах свету сёння вядуцца размовы пра перагляд падыходаў да рабочых спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Некаторыя рабочыя спецыяльнасці або ўжо зніклі, або блізкія да знікнення. Замест іх з'яўляюцца іншыя, з прынцыпова новым узроўнем падрыхтоўкі. Цяпер, каб выконваць на вытворчасці спецыяльныя функцыі, рабочаму недастаткова валодаць толькі пэўнымі навыкамі — трэба мець шырокі дыяпазон ведаў у сумежных галінах.

З 2011 года ва ўстановах прафесійнай адукацыі нашай краіны пачалі рыхтаваць рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, паколькі інтэграваліся функцыі рабочага, тэхніка і інжынера. Так з'явіўся клас высокакваліфікаваных рабочых, якія кіруюць вытворчымі працэсамі і высокатэхналагічным абсталяваннем. Гэтая праграма ўведзена, напрыклад, па спецыяльнасці «Эксплуатацыя мехатронных сістэм прамысловага абсталявання». Выпускнікі, якія яе атрымалі, запатрабаваныя ў машынабудаванні, станкабудаванні, радыёэлектроннай, перапрацоўчай, харчовай прамысловасці. А ў каледжы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій Акадэміі сувязі ў гэтым годзе адкрылася новая спецыяльнасць «Інфармацыйныя кабельныя сеткі».

## Цэнтры кампетэнцый

— Авалоданне прафесіяй немагчымае без тэхналогій і абсталявання, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням. Каб навучэнцы мелі доступ да высокатэхналагічнага абсталявання, у краіне створаны 51 рэсурсны цэнтр ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Яны досыць раўнамерна размеркаваныя па рэгіёнах. 19 з іх маюць інавацыйнае абсталяванне, дзякуючы якому стала магчымай апераджальная падрыхтоўка: каб нашы выпускнікі праз тры-чатыры гады адпавядалі патрабаванням, якія будуць прад'яўляцца на вытворчасці будучыні, — кажа Аляксандра Пятрова.

**Рабочаму недастаткова валодаць толькі пэўнымі навыкамі — трэба мець шырокі дыяпазон ведаў у сумежных галінах.**

Рэсурсныя цэнтры дзейнічаюць па прынцыпе сеткавага ўзаемадзеяння паміж установамі прафесійнай адукацыі. З гэтага вучэбнага года іх база будзе выкарыстоўвацца таксама і для практычнага навучання студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. Дарэчы, у новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі рэсурсныя цэнтры будуць пераймянаваныя ў цэнтры кампетэнцый, што адпавядае іх зместу і сутнасці.

Як адзначыў Валерый Галубоўскі, далучэнне нашай краіны ў 2014 годзе да сусветнага руху WorldSkills адкрыла перад сістэмай прафесійнай адукацыі новыя магчымасці. Галоўная мэта WorldSkills — папулярызацыя рабочых прафесій у сучасным грамадстве, у тым ліку праз правядзенне нацыянальных і міжнародных спаборніцтваў, якія яшчэ называюць алімпіядай у прафесійным майстэрстве. У сусветнага руху WorldSkills ёсць дэвіз «Удасканальвай свет прафесійнымі навыкамі».

Кожныя два гады праходзіць сусветнае першынство ў шасці сферах: транспарт і лагістыка, будаўніцтва і тэхналогіі будаўнічай вытворчасці, тэхналогіі вытворчасці і тэхналогіі машынабудавання, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, творчыя прафесіі і сацыяльна-бытавое абслугоўванне. Але спаборніцтвы праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб спрыяць распаўсюджванню ў свеце міжнародных прафесійных стандартаў. Прафесійныя стандарты WorldSkills — гэта стандарты заўтрашняга дня.

**Значэнне мае ўсё: і прыцягальнасць назвы, і змест падрыхтоўкі, і наяўнасць сучаснага адукацыйнага асяроддзя, якое дазваляе сфарміраваць адпаведныя кампетэнцыі, і кваліфікацыя педагогаў (ці здольныя яны зрабіць працэс навучання захапляльным).**

— Развіваючы ў Беларусі гэты рух, мы праследавалі тры мэты, — канстатуе Валерый Галубоўскі. — Перш за ўсё, гэта абнаўленне зместу вучэбных праграм у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі. Рыхтуючы зборную, мы бачым заданні, якія распрацоўваюцца сусветнымі экспертамі, і разумеем, да чаго трэба імкнуцца. Таксама нам удалося ўдасканаліць механізм узаемадзеяння заказчыкаў і кадраў. Удзельнічаючы ў падрыхтоўцы нашых хлопцаў і дзяўчат да нацыянальнага альбо сусветнага чэмпіянату, зацікаўленыя прадпрыемствы бачаць станоўчыя эфекты, якія могуць атрымаць ад такога супрацоўніцтва. Ведаю нямала выпадкаў, калі прадпрыемствы ўкаранялі тэхналогіі, якія прыйшлі да іх з адукацыі. Конкурснае вытворчае заданне сусветнага ўзроўню сумесна выконваюць прадстаўнікі адукацыі і вытворчасці, укараняючы складаныя сучасныя тэхналогіі. Дарэчы, каб зразумець, наколькі кампетэнцыі, якімі валодаюць навучэнцы і выпускнікі беларускіх устаноў адукацыі, адпавядаюць сусветным стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў, трэба выкарыстоўваць міжнародныя індыкатары якасці. А гэта стала магчымым дзякуючы руху WorldSkills. Яшчэ адзін эфект — з'яўленне новых спецыяльнасцяў. Так, па выніках трэцяга чэмпіянату Worldskills з'явілася патрэба ў спецыялістах у сухім будаўніцтве. Быў распрацаваны адпаведны адукацыйны і прафесійны стандарт і адкрыты набор.

Яшчэ адзін несумненны плюс руху WorldSkills — павышэнне прывабнасці сістэмы прафесійнай адукацыі ў вачах моладзі. На спаборніцтвы часта прыходзяць школьнікі, якія знаёмяцца з сучаснымі прафесіямі і з цікавасцю назіраюць за работай канкурсантаў. Гэта выдатны спосаб прафарыентацыі і агітацыі на карысць рабочых прафесій.

**Сачыць за мерапрыемствамі «Тыдня прафесійнай адукацыі» можна на аднайменным YouTube-канале, а пазнаёміцца з падрабязным раскладам на кожны дзень — на сайце www.profiweek.by.**

Прафарыенцір

# Цень на дзень: хімія з акцэнтам на практыку

**Сталічныя школьнікі на адзін дзень сталі студэнтамі хімічнага факультэта БДУ дзякуючы старту прафарыентацыйнага праекта «Chemical Shadow day BSU — Цень на Дзень БДУ». Акцыя была ініцыяваная студэнтамі хімфака для знаёмства старшакласнікаў з прафесіяй хіміка і аказання ім дапамогі ў выбары будучай спецыяльнасці і месца вучобы.**

Першымі ўдзельнікамі сталі старшакласнікі, якіх адабралі па выніках ацэньвання іх матывацыйных лістоў. Унікальнасць праекта заключаецца ў атрыманні магчымасці школьнікам правесці дзень у навуковых лабараторыях, каб канчаткова вызначыцца з кірункам будучай прафесіі. Сёння падрыхтоўка хімікаў у БДУ праводзіцца па шасці спецыяльнасцях, кожная з якіх мае сваю спецыфіку з улікам спалучэння фундаментальных ведаў і навуковага падыходу. Акцэнт у дадзеным праекце зроблены на пашырэнні ўяўлення школьнікаў аб практычным значэнні хімічных навук.

Для хлопцаў і дзяўчат правялі экскурсіі па лабараторыях факультэта і Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем. Школьнікі змаглі далучыцца да работы навукоўцаў, даведацца аб інавацыйных распрацоўках, убачыць хімічныя доследы ў рэальнасці і атрымаць адказы на пытанні, якія іх цікавяць, ад вядучых навуковых спецыялістаў.

Так, гасцей запрасілі ў лабараторыі раствораў цэлюлозы і прадуктаў іх перапрацоўкі, хіміі свабодных радыкалаў, тэхналогіі лекаў, біяхіміі лекавых прэпаратаў, лекавых прэпаратаў на аснове поліцукрыдаў і іншыя. Акрамя таго, абітурыенты атрымалі кансультацыйную дапамогу па пытаннях паступлення на хімічны факультэт.

Плануецца, што акцыя будзе праводзіцца рэгулярна, два разы на год. Пакуль яна носіць пілотны характар, каб ацаніць яе запатрабаванасць сярод школьнікаў.

Хімічны факультэт БДУ ўяўляе сабой найбуйнейшы навукова-даследчы і педагагічны комплекс. Студэнты маюць магчымасць стажыравацца ў аўтарытэтных навукоўцаў і працаваць над сумеснымі праектамі. Будучыя хімікі атрымліваюць фундаментальныя тэарэтычныя веды і вучацца прымяняць іх на практыцы, авалодваюць найноўшымі методыкамі хімічнага аналізу і даследавання.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Дзень, які нам варта адзначаць

# «К ШЧАСЦЮ Ў ШЫРОКІЯ ДАЛІ...»

## Падзел і ўз'яднанне Беларусі ў творчасці Якуба Коласа

15 мая 1921 года Якуб Колас разам з сям'ёй пасля шасці гадоў разлукі з радзімай прыязджае ў Мінск. Родную зямлю паэт быў вымушаны пакінуць у сувязі з падзеямі Першай сусветнай вайны. У верасні 1915 года Якуб Колас быў мабілізаваны ў царскую армію. Пасля вучобы ў Аляксандраўскім ваенным вучылішчы ў Маскве ён накіроўваецца ў запасны полк у Пярмі. У ліпені 1917 года пісьменніка прызначаюць начальнікам эшалона і накіроўваюць на Румынскі фронт. У хуткім часе паэт цяжка захварэў і быў камісаваны з арміі. Якуб Колас прыязджае ў горад Абаянь Курскай губерніі, там разам з сынамі Данілам і Юркам жыве жонка паэта Марыя Дзмітрыеўна. На Куршчыне пісьменнік працуе настаўнікам і школьным інспектарам. У многіх паэтычных радках Якуба Коласа адчуваецца сум па роднай краіне і жаданне хутчэй вярнуцца ў родны кут:

*Благаслаўлёны час той будзе,*
*Калі ў родным сваім людзе*
*Куточак бацькаў прывітаю*
*І радасць жыцця там пазнаю...*

Вяртанне на радзіму стала магчымым толькі па хадатайніцтве Наркамасветы БССР. Родная зямля дае сілы для плённай літаратурнай працы. З друку выходзяць «Казкі жыцця» (1921), зборнік вершаў «Водгулле» (1922), аповесць «У палескай глушы» (1923), паэмы «Новая зямля» (1923) і «Сымон-музыка» (1925).

Але шчасце паэта не было поўным. Для Якуба Коласа сумнай падзеяй стаў Рыжскі мірны дагавор, згодна з якім да Польшчы адышла Заходняя Беларусь. *«К чорту іх межы! К д'яблу граніцы! Нашы тут гоні, бары!»* — гнеўна пісаў Якуб Колас у вершы «Беларускаму люду». На тым баку ад мяжы засталіся родныя і блізкія, сябры і знаёмыя пісьменніка. Як жа горка было паэту ад таго, што ён не змог правесці ў апошні шлях сваю маці, якой не стала ў 1929 годзе, паехаць на пахаванне было немагчыма.



Якуб Колас з жонкай Марыяй Дзмітрыеўнай і сынам Данілам. Перм, 1917 год.

*«Беларуская зямля па Рыжскім дагаворы, якім заканчвалася вайна з белапанскай Польшчай,* — пісаў Якуб Колас, — *была падзелена на дзве амаль роўныя часткі. Балюча было ўсведамляць, што мяжа, раздзяляўшая адналітную краіну, прайшла па самым сэрцы яе»*.

Толькі праз дваццаць гадоў пасля разлукі з малой радзімай давялося Якубу Коласу пабачыць яе з акна вагона, калі ён у 1935 годзе ехаў у Парыж на Міжнародны кангрэс пісьменнікаў у абарону міру. *«З вялікім хваляваннем і жалем пазіраў я на тыя мясціны,* — пісаў Я. Колас, — *дзе калісь хадзіў я і ездзіў. Тыя ж убогія, вузенькія палоскі зямлі, тыя ж панскія маёнткі... Усюды на станцыях пышныя постаці паноў, паўпанкаў і розных дробных шляхцюкоў. І толькі дзе-нідзе на задворках мільгала заношаная світка беларуса»*. Уражанні і перажыванні ад паездкі вылiлiся ў верш «З дарогі»:

*І горкім палыном*
*Павеяла ад песні, ўжо забытай...*
*Мой родны край і дом*
*Пад белым пад арлом!*
*Нядоляю ты цяжкаю спавіты.*
*І я, твой родны сын,*
*Чужынцам у табе сябе*
*ўжо адчуваю...*

Якуб Колас піша вершы, у якіх рэзка выступае супраць гвалту над жыхарамі Заходняй Беларусі — «Панам», «Братам Заходняй Беларусі», «Ворагам», «Панам-ваякам», «Польскім катам» і інш.

У студзені 1927 года «Савецкая Беларусь» друкуе падпісаны Коласам, Купалам, Піятуховічам, Замоцiным і іншымі зварот да вучоных Захаду ў сувязі з разгромам Беларускай сялянска-работніцкай грамады і масавым тэрорам у Заходняй Беларусі. У гэтым жа нумары змешчаны верш Коласа «Братам Заходняй Беларусі (на разгром Грамады)»:

*Няхай паны ў сваёй дурноце*
*Мацней сціскаюць абцугі,*
*Каб вас душыць у злосным гнёце.*
*Каб на калючым панскім дроце*
*Павесіць скарб наш дарагі...*
*Няхай шалее гэта зграя,*
*Няхай чадзіць «святы» дурман.*
*Каб выбіць з бедняга ратая*
*Прагненне к волі таго краю,*
*Дзе не прышчэпіцца больш пан...*

Якуб Колас упэўнены, што *«мінецца ліха-гора, і панскі шал затхнецца скора, бо стукне молат па панах»*. Так, у вершы «Заходняй Беларусі» паэт піша:

*О Беларусь у польскіх межах!*
*Цябе распялі на крыжы,*
*Твой дом запоўнілі вужы,*
*І дзеліць кат тваё адзежы.*
*Але ўсяму свая ёсць мера:*
*Надыдзе неўнікнёны час,*
*І будзе суд заслужаны мас, —*
*Адплату ён нясе вам, зверы!*

Прыйшоў час, і *«магутная Чырвоная Армія перайшла граніцу і ў некалькі дзён вызваліла Заходнюю Беларусь, несучы ёй доўгачаканае збавенне і волю,* — пісаў Колас. — *Не было канца радасці беларускага народа. З якою шчырасцю, з якім захапленнем сустракаў ён сваіх братоў, воінаў Чырвонай Арміі! Гэта былі незабыўныя дні, гэта было шчаслівае адраджэнне народа, які амаль дваццаць гадоў жыў у цяжкай панскай няволі»*.

19 верасня 1939 года ў газеце «Звязда» Якуб Колас друкуе артыкул «Браты Заходняй Беларусі», у якім вітае працоўных Заходняй Беларусі з днём вызвалення. У газеце «Звязда» ад 22 верасня 1939 года быў змешчаны верш Коласа «Свайму народу»:

*На простар, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою, —*
*Сотні новых і ясных дарог*
*Рассцілае жыццё прад табою!..*
*Новай доляй узыходзіць зара,*
*Будзеш жыць ты без панскай апекі:*
*Адышла, адцвіла іх пара,*
*І панам не вярнуцца навекі...*

На гэту ж тэму напісаны верш «Гудзе зямля, дрыжаць лясы...», які быў надрукаваны ў газеце «Звязда» 5 кастрычніка 1939 г.:

*Няма граніц, няма паноў —*
*Сышло іх панаванне:*
*Збуцвеўшы лад былых вякоў*
*З магілы не паўстане...*

8 кастрычніка 1939 года Якуб Колас у складзе брыгады беларускіх пісьменнікаў (Купала, Бядуля, Аксельрод, Маўр, Паслядовіч і інш.) выязджае ў Беласток для правядзення творчых вечароў і ўдзелу ў падрыхтоўцы да выбараў у Народны сход. Газета «Звязда» друкуе артыкул Коласа «Народам Заходняй Беларусі» пад газетным загалоўкам «Працоўныя Заходняй Беларусі! Адзіным фронтам ідзіце на выбары народных прадстаўнікоў у Народнае Сабранне». У Беластоку сумесна з Купалам Колас піша зварот да пісьменнікаў Заходняй Беларусі, дзе заклікае іх у вольную сям'ю песняроў і пісьменнікаў і працягвае руку братняй дапамогі. 11 кастрычніка Колас выступае з прамовай на сустрэчы з беластоцкай інтэлігенцыяй, чытае верш «Свайму народу», 12 кастрычніка выступае на вечары культуры ў тэатры «Апалон», 13 кастрычніка выступае з прамовай на перадвыбарчым сходзе настаўнікаў Беластока, 15 кастрычніка разам з Янкам Купалам вяртаецца ў Мінск. У той жа дзень у газеце «Звязда» быў змешчаны верш «Радасная сустрэча».

25 кастрычніка датуецца верш «Наперад», які ўпершыню быў змешчаны ў газеце «Звязда» 28 кастрычніка. Пазней верш друкаваўся з падзагалоўкам «Да дня 28.Х.1939». У гэты дзень дэпутаты Народнага Сходу Заходняй Беларусі ў Беластоку прынялі рашэнне аб далучэнні Заходняй Беларусі да БССР.



Якуб Колас і Янка Купала на сустрэчы з настаўнікамі Беластока. 1939 год.

*Дні беспрасвецця ў нябыт адышлі,*
*Сонца ўзыходзіць над краем.*
*Вольныя людзі раскутай зямлі,*
*Песняю вас мы вітаем.*
*Збіты кайданы чорнае ночы,*
*Сцёрты старыя скрыжалі.*
*Смела наперад, люд наш рабочы,*
*К шчасцю ў шырокія далі...*

28 кастрычніка Колас удзельнічае ў рабоце Народнага Сходу Заходняй Беларусі, выступае з прывітальнай прамовай.




Вокладка кнігі «Рыбакова хата».

У лісце да Сяргея Гарадзецкага ад 2 лістапада 1939 года Якуб Колас піша: «Вчера возвратился из поездки в Западную Белоруссию. Ездил в составе делегации от трудящихся Советской Белоруссии для приветствия Народного собрания. Потрясающее, глубоко волнующее впечатление произвело это собрание. Мне никогда еще не случалось видеть такой съезд, такой народный сход, где бы с такой силой изливалась душа народа, его горькая обида... Меня также глубоко взволновало и то обстоятельство, что белорусский народ не забыл и своих певцов, меня и Купалу, и выразил нам огромную свою признательность... Я встретил много лиц, рассказавших о своём жизненном пути. Сколько тем для поэта и писателя!..»

Якуб Колас пачынае працу над новай паэмай «Рыбакова хата». Ва ўступе да публікацыі ў газеце «Савецкі селянін», дзе быў апублікаваны ўрывак з паэмы, паэт адзначаў: «Тэма і змест паэмы — барацьба беларускага народа за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне з-пад панскага гнёту».

4 лістапада 1939 года ў газеце «Звязда» друкуецца верш «Вольнаму народу», які напісаны Коласам з нагоды прыняцця 2 лістапада 1939 года закона аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР:

*Спета бясслаўна панская песня.*
*Кончана з панам, пан не ўваскрэсне,*
*У край наш не знойдзе дарог.*
*Вольным народам сталі вы сёння.*
*Вашы ўсе пожні, вашы ўсе гоні,*
*І шлях вам, як сонца, пралёг...*

**Васіліна МІЦКЕВІЧ,**
**галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа.**

---

# УЗБЕКІСТАН — БЕЛАРУСЬ

## Згадваючы Якуба Коласа, Сцяпана Ліхадзіеўскага...

**У Выдавецкім доме «Звязда» прайшла сустрэча з гасцямі з Узбекістана. Да журналістаў і кнігавыдаўцоў завіталі дарадца Пасольства Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматула НАЗАРАЎ і дырэктар Цэнтра народнай дыпламатыі Шанхайскай Арганізацыі Супрацоўніцтва ва Узбекістане Кабулжан САБІРАЎ.**

Падчас размовы, прысвечанай сучаснаму стану развіцця беларуска-ўзбекскіх сувязяў у гуманітарнай, культурнай, літаратурнай сферах, былі выказаны цэлы шэраг прапаноў аб сумесных ініцыятывах.

— У нас, у Ташкенце, у галоўнай бібліятэцы краіны працуе аддзел літаратуры краін ШАС — і паўнавартасных членаў арганізацыі, і назіральнікаў, — расказаў спадар Кабулжан Сабіраў. — Ёсць і кнігі з Беларусі — на беларускай і рускай мовах. Спадзяёмся, што гэты аддзел у найбліжэйшы час будзе істотна папоўнены літаратурай, выдадзенай у Мінску. Зусім нядаўна мы выдалі на ўзбекскай мове шыкоўна аформленую анталогію казак краін ШАС. Цяпер гэты ўнікальны зборнік з 88 казак розных народаў перакладзены на кітайскую мову. У хуткім часе пабачыць свет і анталогія на рускай мове. Упэўнены, што праект будзе рэалізаваны і ў Беларусі. Мы памятаем пра повязь з Узбекістанам народнага песняра Беларусі Якуба Коласа, а таксама паэтаў, празаікаў, перакладчыкаў Эдзі Агняцвет, Сцяпана Ліхадзіеўскага, іншых беларускіх мастакоў слова. Лічым, што вельмі важна было б скласці анталогію іх твораў, прысвечаных Узбекістану, і выдаць яе ў перакладзе на ўзбекскую мову.

У сваю чаргу дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч звярнуў увагу на шэраг здзейсненых у Беларусі выдавецкіх і медыйных праектаў, прысвечаных розным аспектам беларуска-ўзбекскіх гістарычных, культурных сувязяў.

— Сярод заснавальнікаў нашага Цэнтра народнай дыпламатыі — і Саюз пісьменнікаў Узбекістана, — падкрэсліў Кабулжан Сабіраў. — І гэта абавязвае нас зрабіць мастацкі пераклад адным з найважнейшых кірункаў народнай, літаратурнай дыпламатыі.

**Раман СЭРВАЧ.**

# ПЕРШАЯ КРЫПТАРЭСПУБЛІКА

## Навошта Сальвадор прызнаў біткоін?

**Невялікая цэнтральнаамерыканская дзяржава Сальвадор на гэтым тыдні аказалася сярод цэнтральных загалоўкаў сусветных інфармагенцтваў. Днямі тут упершыню ў свеце прызналі галоўную крыптавалюту біткоін законным плацежным сродкам. У адпаведнасці з законам, які ўступіў у сілу 7 верасня, усе прадпрыемствы і арганізацыі абавязаны прымаць «крыпту» для аплаты тавараў і паслуг нароўні з доларам ЗША. Уласнай валюты гэтая краіна не мае. Навошта Сальвадор прызнаў біткоін?**




### ПРОПУСК У «ЛІЧБУ»

Раней грашовай адзінкай краіны быў сальвадорскі калон. Пасля ад выкарыстання гэтай валюты ўрад Сальвадора адмовіўся. З 2001 года ў краіне выкарыстоўваецца долар ЗША. Калон цалкам выведзены з абарачэння ў 2004-м.

Харызматычны і папулярны 40-гадовы прэзідэнт Сальвадора Наіб Букеле, які ініцыяваў прыняцце закона аб біткоіне, сцвярджае, што гэтая мера падштурхне эканамічны рост і зробіць прасцейшым і таннейшым перавод на радзіму сродкаў, якія зарабляюць сальвадорцы за мяжой. «У кароткатэрміновай перспектыве гэта створыць працоўныя месцы, забяспечыць фінансавую інклюзію тысячам людзей, якія сёння знаходзяцца за межамі фармальнай эканомікі», — заявіў прэзідэнт Сальвадора прывёў у «Твітэры» наступныя разлікі: нават калі максімальная капіталізацыя біткоіна складала 680 мільярдаў долараў, то ўкладанне нават аднаго працэнта гэтых сродкаў павялічыць ВУП Сальвадора на чвэрць.

Паводле яго слоў, каля 50 тысяч грамадзян краіны ўжо карыстаюцца біткоінам, адзначыла «Бі-бі-сі». «Упершыню ў гісторыі погляды ўсяго свету накіраваны на Сальвадор, і гэта адбудзецца дзякуючы біткоіну», — напісаў раней Букеле ў «Твітэры». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы прызнаў, што «любы праект, які нацэлены ў будучыню, не прыносіць выніку на наступны дзень або праз месяц». Нацыянальны кангрэс, дзе большасць належыць прыхільнікам прэзідэнта, у чэрвені прыняў прадстаўлены ім законапраект праз суткі пасля яго паступлення ў палату.

Што вядома пра прэзідэнта-рэфарматара Наіба Букеле? Ён нарадзіўся ў 1981-м у Сан-Сальвадоры, яго продкамі былі палесцінскія мігранты. Ва ўзросце 18 гадоў заснаваў сваю першую кампанію. Пачаў палітычную кар'еру ў партыі левага кшталту «Фронт нацыянальнага вызвалення імя Фарабунда Марці». Быў выключаны з партыі за «непавагу» да правоў жанчын і за тое, што кінуў яблыкам у аднаго з рэгіянальных лідараў. Эксперты апісвалі яго як апартуніста і антысістэмнага палітыка. Ён тройчы змяняў палітычныя партыі перад рознымі выбарамі. Букеле перамог на выбарах прэзідэнта летам 2019 года. Пры ўступленні на пасаду прызначыў ва ўрад восем жанчын, у тым ліку сем кіраўнікоў міністэрстваў.

Паводле ацэнкі Букеле, грамадзяне будуць эканоміць дзякуючы новаўвядзенню да 400 мільёнаў долараў у год. Летась пераводы з-за мяжы ад паўтара мільёна сальвадорцаў, якія працуюць у асноўным у ЗША, склалі 5,9 мільярда долараў, ці амаль чвэрць — 23 працэнты ВУП Сальвадора, — найвышэйшы паказчык у свеце. Банкі спаганяюць за падобныя пераводы камісію, яны могуць займаць некалькі дзён, і часам жыхарам краіны неабходна прыходзіць па грошы асабіста.

Дырэктар праекта Bitcoin Beach, які займаецца прасоўваннем крыптавалюты ў Сальвадоры, Майк Петэрсан адзначыў, што ў адрозненне ад ЗША і Еўропы большасць сальвадорцаў не маюць банкаўскіх рахункаў і магчымасці карыстацца плацежнымі дадаткамі. «Цяпер яны атрымліваюць пропуск у лічбавы свет, змогуць разлічвацца анлайн, пасылаць адзін аднаму грошы на адлегласці ў сотні міль, і ўсё гэта пры амаль нулявой камісіі», — заявіў ён.

> **Харызматычны і папулярны 40-гадовы прэзідэнт Сальвадора Наіб Букеле, які ініцыяваў прыняцце закона аб біткоіне, сцвярджае, што гэтая мера падштурхне эканамічны рост і зробіць прасцейшым і таннейшым перавод на радзіму сродкаў, якія зарабляюць сальвадорцы за мяжой.**

Петэрсан не сумняваецца, што станоўчы эфект неўзабаве праявіцца сябе. «Людзі змогуць назапашваць, каб зрабіць у сваім доме новы дах, купіць карову ці пасляць дзяцей у школу — тое, чаго раней яны былі пазбаўлены», — кажа ён.

«Гэта павінна быць выгадна. Мае родныя ў ЗША змогуць пераводзіць грошы амаль бясплатна», — сказала агенцтву Reuters Рэйна Ісабэль Агілар, гаспадыня крамы ў горадзе Эль-Зонтэ за 50 кіламетраў на паўднёвы захад ад сталіцы краіны Эль-Сальвадора. Мільёны жыхароў могуць атрымаць прамую выгаду ад увядзення біткоіна ў якасці нацыянальнай валюты ўжо цяпер. Грамадзяне, якія ўстановяць на сваіх тэлефонах спецыяльна створаны для гэтага дадатак-крыптакашалёк Chivo, атрымаюць каля 30 долараў у біткоінах.




### ВІРТУАЛЬНАЕ КАЗІНО

Урад таксама ўстанавіў па ўсёй краіне дзвесце электронных банкаматаў для канвертавання біткоіна ў долары без камісіі. Некаторыя з іх ахоўваюць ваенныя, каб не дапусціць вандалізму з боку праціўнікаў крыптавалюты. У пачатку верасня фінансавая камісія заканадаўчага сходу Сальвадора зацвердзіла траставы фонд у памеры 150 мільёнаў долараў для падтрымкі плана па легалізацыі біткоіна. З часам гэтая сума можа быць павялічана.

Сальвадор называюць краем азёр і вулканаў, паколькі на невялікай тэрыторыі дзяржавы знаходзіцца вялікая колькасць як патухлых, так і дзеючых вулканаў. Адпаведна, у краіне дастаткова актыўна развітая геатэрмальная энергетыка. У выніку, як заўважыў Наіб Букеле, у Сальвадоры будзе рэалізаваны майнінг біткоіна з дапамогай вулканаў.

Для падтрымкі Сальвадора карыстальнікі сацыяльных сетак Twitter і Reddit пачалі скупляць «біткі». Яны зладзілі акцыю, у рамках якой прапаноўваецца выдаткаваць 30 долараў на куплю невялікай долі біткоіна. Зрэшты, далёка не ўсе сальвадорцы сустрэлі інавацыю з аптымізмам. Людзі асцерагаюцца, што валатыльнасць — зменлівасць кошту біткоіна — можа негатыўна адбіцца на сацыяльных выплатах.

Паводле вынікаў даследавання, праведзенага Цэнтральнаамерыканскім універсітэтам (UCA), большасць жыхароў Сальвадора выказаліся супраць рашэння ўлад увесці біткоіны ў якасці законнага плацежнага сродку. Яшчэ напярэканцы жніўня ў сталіцы Сальвадора ўспыхнулі пратэсты — сотні незадаволеных грамадзян выйшлі на вуліцы. Лацінаамерыканцы асцерагаюцца, што ўкараненне крыптавалюты паспрые карупцыі, паведаміў Business Insider.

Эксперты мяркуюць, што пратэсныя настроі ў Сальвадоры ў тым ліку выкліканыя страхам перад невядомасцю. Як паказала апытанне навуковага выдання Disruptiva, 30 % насельніцтва краіны паняцця не маюць, што такое біткоін, а больш за палову рэспандэнтаў назвалі рашэнне ўрада «цалкам няправільным». «Мае дочкі, якія працуюць у ЗША, сказалі, што яны лепш будуць плаціць 10–15 долараў за перавод ста долараў звычайным спосабам. З біткоінам яны адчувалі б сябе няўпэўнена», — сказаў карэспандэнту Reuters мясцовы жыхар Хуліа Рамірэс.

Сусветны банк, МВФ і сусветныя фінансавыя аналітыкі таксама сумняваюцца ў правільнасці рашэння Сальвадора. «Гэта можа быць і пачаткам рэалізацыі доўгатэрміновага плана па ўвядзенні ўласнай крыптавалюты, «стэйблкоіна», якая будзе забяспечана замежнымі актывамі і заклікана паступова выцесніць з эканомікі долар», — мяркуе лонданская газета Financial Times.




Эксперты не выключаюць, што легалізацыя біткоіна прытармозіць выдачу Сальвадору запланаванай пазыкі МВФ у памеры мільярда долараў. Агенцтва Moody's панізіла крэдытны рэйтынг Сальвадора, што можа адбіцца на кошце яго даўгавых абавязацельстваў, намінаваных у доларах. У прыватнасці, фінансавыя аналітыкі асцерагаюцца, што выкарыстанне біткоіна можа дапамагаць адмыванню грошай. Таксама кажуць аб звязаных з ім высокіх макраэканамічных рызыках і юрыдычнай нявызначанасці. Па меркаванні эканаміста Цэнтральнаамерыканскага інстытута бюджэтных даследаванняў Рыкарда Кастанеды, «урад паставіў на кон больш за 200 мільёнаў долараў у віртуальным казіно, і гэта грошы падаткаплацельшчыкаў».

### У ПЕРШЫ СВЕТ

У адказ на такія сумненні Букель выклаў у «Твітэры» відэа ў стылістыцы фільма Квенціна Таранціна «Джанга вызвалены». У ім ён сячэ рабагандляра з эмблемай МВФ замест твару. «Час скончыць з ранейшай парадыгмай! Сальвадор мае права імкнуцца ў «першы свет», — абвяшчаў подпіс. Пазней Букель выдаліў свой твіт.

Напярэдадні ўвядзення «крыпты» ў якасці нацыянальнай валюты Сальвадор купіў 400 «біткоў» (каля 20 мільёнаў долараў па бягучым курсе), што прывяло да рэзкага росту курсу крыптавалюты: ён перавысіў 52 тысячы долараў. Праўда, літаральна праз некалькі гадзін інвестары пачалі ўсведамляць рызыкі, і курс апусціўся да прыкладна $50 тыс. У дзень, калі краіна афіцыйна прызнала токен, яе мясцовую сістэму крыптакашалькоў Chivo прыйшлося часова адключыць з-за цяжкасцяў з прапускной здольнасцю, растлумачыў Bloomberg. У выніку «крыпта» зноў патаннела. Кошт біткоіна знізіўся да $42,8 тысячы, вынікае з даных крыптавалютнай біржы Binance. Наіб Букель распавёў у сваім мікраблогу, што краіна скарысталася сітуацыяй і падчас падзення купіла 150 біткоінаў у дадатак да ўжо набытых напярэдадні 400. «Падобна, зніжкі скончыліся», — напісаў Букель, калі кошт крыптавалюты стаў расці.

Вопыт Сальвадора дапаможа зразумець рызыкі прызнання біткоіна і іншых крыптавалют афіцыйным плацежным сродкам. Такое меркаванне выказаў ТАСС кіраўнік Асацыяцыі ўдзельнікаў рынку электронных грошай і грашовых пераводаў Віктар Достаў. «У нас будзе выдатны краінавы эксперымент. І па выніку мы праз нейкі час на іх прыкладзе зразумеем рызыкі такой гісторыі, рызыкі афіцыйнага прызнання біткоіна і іншых крыптавалют — у прыватнасці, як яны ўплываюць на дзяржаўную манетарную палітыку», — заўважыў эксперт.

Палітыку Сальвадора падтрымаў Цэнтральнаамерыканскі банк эканамічнай інтэграцыі (CABEI). Пазіцыю CABEI, як аб'яднанага органа, падтрымліваюць яго краіны-члены, сярод якіх Гватэмала, Гандурас, Нікарагуа, Коста-Рыка, Панама, Дамініканская Рэспубліка, Беліз, Мексіка, Аргенціна, Калумбія, Іспанія, Куба, Паўднёвая Карэя. Гэта сведчыць аб тым, што большасць з іх згодных з рашэннем Сальвадора. Ёсць шэраг дзяржаў, якія ў будучыні могуць прыняць біткоін у якасці сродку плацяжу.

> **Вопыт Сальвадора дапаможа зразумець рызыкі прызнання біткоіна і іншых крыптавалют афіцыйным плацежным сродкам.**

Такія крокі абумоўлены рынкавай кан'юнктурай. Кіраўнік нью-ёркскай даследчай кампаніі Chainalysis Майкл Гранагер, які з'яўляецца таксама сузаснавальнікам крыптабіржы Kraken, заявіў, што, па яго ацэнцы, біткоін да канца гэтага года пераадолее ўзровень у 100 тысяч долараў. Эксперт мяркуе, што крыптавалюта № 1 знаходзіцца ў фазе цэнавага ўздыму. Standard Chartered, адзін з вядучых брытанскіх банкаў, выпусціў сваю першую справаздачу, прысвечаную крыптарынку. Згодна з інфармацыяй, да якой атрымалі доступ журналісты, аналітыкі фінансавай установы чакаюць знаходжанне біткоіна ў межах ад 50 да 175 тысяч долараў.

**Захар БУРАК.**

# ЧЫМ ХАТА БАГАТА

## Бытавая тэхніка: карысная і бессэнсоўная

**Няхай жыве навукова-тэхнічны прагрэс, які робіць наша жыццё лягчэйшым! Бытавая тэхніка сёння прадстаўлена ў такім шырокім асартыменце, што разбягаюцца вочы. І здаецца, што трэба наогул усё — такое прыгожае, такое «смарт», якое адкрывае столькі шляхоў «расфарбаваць шэрыя будні».**



Іншая справа, што бытавая тэхніка — задавальненне зусім не таннае. Але не будзем разважаць на тэму матэрыяльных магчымасцяў сярэднестатыстычнай беларускай сям'і. Пагаворым аб рэальнай неабходнасці таго ці іншага «памочніка» ў вашым жыцці. Як не марнаваць грошы на непатрэбныя «прыбамбасы», а захаваць іх для сапраўды карысных гаджэтаў?

З вашага дазволу не будзем таксама канцэнтравацца на сапраўды неабходных у сучасным жыллі рэчах (халадзільнік з маразільнай камерай той ці іншай ёмістасці, пліта або варачная паверхня, духавая шафа, выцяжка, мікрахвалёўка, класічны пыласос і пральная машына). Тут спрачацца няма аб чым. Але акрамя гэтага «джэнтльменскага набору», у свеце ёсць яшчэ столькі ўсяго: ад тостараў і ўвільгатняльнікаў паветра да хлебапечак і ёгуртніц, яйцаварак і марожаніц! Вось пра іх і пагаворым. Не пра ўсе — іх занадта шмат. Але хоць бы пра некаторыя.

### НАБЫВАЕМ АДНАЗНАЧНА!

Больш за ўсё бытавой тэхнікі вынайдзена для кухні. Гэта месца не толькі натхняе на кулінарную творчасць, але і стымулюе палёт тэхнічнай думкі.

**Кухонны камбайн.** Лідар па продажах сярод «неабавязковай, але вельмі карыснай бытавой тэхнікі», кажа прадавец-кансультант крамы «5 элемент» Яўген.

— Гэта разумнае ўкладанне: добры кухонны камбайн сэканоміць вашы сродкі, замяніўшы мясарубку, сокавыціскалку, міксер, блэндар і г. д.

Дзякуючы сістэме здымных блокаў, з дапамогай кухоннага камбайна можна здрабняць прадукты, гатаваць фарш, дзіцячае пюрэ, express, кактэйлі і смузі, свежавыціснуты сок; націраць, шынкаваць, рэзаць лустачкамі і кубікамі (больш якасна, чым рукамі), замешваць цеста і г. д.

Кухонныя камбайны вельмі адрозніваюцца па канструкцыі і функцыяналe, распавеў Яўген. У недарагіх мадэляў усяго некалькі асноўных функцый, дарагія ўражваюць разнастайнасцю — накшталт функцый «марожаніца» або «фарміраванне хатніх макарон». Разумным здаецца рашэнне «сабраць пазл» самастойна, набываючы зменныя часткі камбайна асобна (у некаторых вытворцаў гэта магчыма). Так, вядома, вы збераце ідэальны прыбор менавіта для вашай сям'і. Але, хутчэй за ўсё, цана кухоннага камбайна ў гэтым выпадку атрымаецца вышэйшай, чым калі вы купляеце прыбор са стандартным наборам функцый.

— Важна правільна выбраць аб'ём чашы — звычайна ён 2—4 літры. Рэальная ўмяшчальнасць заўсёды ніжэйшая, чым заяўленая: у чашу аб'ёмам 2 літры вы зможаце змясціць 1,3—1,5 л.

У буйных крамах камбайны прадстаўлены з магутнасцю ад 200 да 2500 Вт. Лепш спыніць выбар на больш моцных прыборах (хоць яны абыдуцца даражэй): маламоцны камбайн даводзіцца эксплуатаваць на мяжы яго магчымасцяў, і, значыць, ён хутчэй выйдзе са строю.

Дыяпазон цэн тут вельмі вялікі: ад 200—500 рублёў да 1400—2000 за дарагія мадэлі ад еўрапейскіх вытворцаў.

**Пасудамыечная машына.** «Без яе можна лёгка абысціся», — скажа вам кожная другая гаспадыня. Але! Гэта скажа вам гаспадыня, якая ніколі не спрабавала карыстацца дадзеным «заваяваннем цывілізацыі». Ну, як на світанку эпохі пральных машын-аўтаматаў прынята было казаць: «Што я, рукамі не памыю?!»

— Я таксама лічыла, што пасудамыйка — бытавая тэхніка з серыі «ў багатых свае дзівацтвы», пакуль не паспрабавала скарыстацца ёю ў доме ў малодшай сястры, — распавяла Ірына, пакупнік сеткі «Электралюкс». — Вы ніколі не адмыеце рукамі тыя ж патэльні, рондалі, бакалы так, як гэта зробіць пасудамыечная машына. Не кажучы ўжо пра тое, што адной падставай для незадаволенасці ў сям'і стане менш: пытанне «Хто будзе мыць посуд?» з гэтага часу будзе знята.

Пагутарыўшы з пакупнікамі, робім высноЎ, што пасудамыйка — мабыць, той рэдкі падарунак з разраду «ў дапамогу гаспадыні», які мужчына можа зрабіць жанчыне на 8 Сакавіка і на дзень нараджэння, не рызыкуючы нарвацца на скандал.

— Тып пасудамыечнай машыны — справа густу, — тлумачыць кансультант. — Але, выбіраючы не ўбудаваную, а асобную мадэль, можна абысціся меншай сумай.

Яшчэ адзін крытэрый — змяшчальнасць. Лічаць яе вытворцы ў камплектах— у мадэлях для хатняга выкарыстання яна можа быць ад 17 камплектаў да 4. Камплект — гэта набор посуду для аднаго чалавека: 2 лыжкі, 2 відэльцы, кубак і сподачак, 4 талеркі (для салаты, супу, другога і дэсерту). А вось «класам мыйкі» турбавацца не варта, распавялі мне. Наогул, класаў бывае тры, самы высокі ўзровень ачышчэння посуду А, самы нізкі — С, але вызначыць адрозненні можна толькі ў лабараторных умовах. У любым выпадку посуд будзе вельмі, да прыемнага скрыпу, чысты.

Не так патрэбна, як можа здацца, і функцыя «Паменшаны расход вады» — скарачэнне колькасці вады ў выпадку, калі машына загружаная не цалкам. Наўрад ці вы будзеце ўключаць пасудамыйку, каб вымыць адну-дзве талеркі. Таксама да лішніх наваротаў належыць функцыя аддаленага кіравання пасудамыечнай машынай са смартфона.

Цана стартуе ад 800 рублёў. У сярэднім прыйдзецца выкласці 1000—1400 рублёў, плюс падключэнне.

**Мультыварка.** Адна з галоўных памагатых на сучаснай кухні.

— Гадоў дзесяць таму аб неабходнасці цуд-рондаля шмат спрачаліся ў сетцы. Сёння меркаванні разышліся: ёсць жанчыны, якія без мультыварккі як без рук, і ёсць тыя, каму па-старому падабаецца гатаваць на пліце, — кажа прадавец-кансультант адной з крам «Электрасіла» Марына. — Але сёння мультыварка — адна з самых запатрабаваных пазіцый бытавой тэхнікі.

Вядома, гэта ўсяго толькі каструля, хоць і сучасная, — сама ў сябе яна прадукты не засыпле, усё роўна прыйдзецца прыкласці рукі да гатавання страў. Але...

— Я мама з двума дзецьмі, — дзеліцца меркаваннем Вераніка. — Працую на адалёнцы, з дому. І мультыварка для мяне — палачка-выручалачка. Галоўны плюс — не трэба ўвесь час знаходзіцца на кухні падчас гатавання ежы: памешваць, падліваць, сачыць, каб не падгарэла. Я загружаю прадукты ў мультыварку і іду гуляць з дзецьмі, вяртаемся ўжо да абеду: дастаткова толькі правільна выбраць рэжым. І яшчэ адзін плюс: у мультыварцы можа гатаваць простыя стравы нават дзіця, напрыклад, мая старэйшая дачка, ёй толькі-толькі споўнілася пяць гадоў. Вядома, ёсць у мультыварккі свае недахопы: напрыклад, выпечка ў ёй атрымліваецца не падрумяненая. Але ж ніхто не замінае некаторыя стравы гатаваць па-старому. Галоўнае — прыбор дазваляе ператварыць кулінарыю з руціны ў творчасць, таму што стаіш каля пліты па ўласным жаданні, а не па неабходнасці.

Выбіраючы мультыварку, важна вывучыць магчымасці канкрэтнага прыбора, раяць прадаўцы. Таму што мультываркай часам называюцца самыя розныя прылады і іх спалучэнні: хуткаварка (гатуе пад ціскам пары), павольнаварка (стравы гатуюцца па прынцыпе тамлення), параварка і г. д. Наступны крытэрый выбару — аб'ём чашы. Ёмістасць на 2,5 літра падыдзе сям'і з двух чалавек. Стандартны выбар большасці спажыўцоў — чаша на 4 літры. Але калі ў сям'і больш за тры чалавекі, лепш купляць мультыварку на 6,5 літра.

Яшчэ адзін нюанс — унутранае пакрыццё чашы мультыварккі. Кераміка добрая і вонкава, і з пункту гледжання эксплуатацыі. Тэфлон таннейшы, аднак няўстойлівы да зносу і драпін.

— Звярніце ўвагу на «адкладзены старт». Гэтая функцыя, як і «падтрыманне стравы цёплай», ёсць не ва ўсіх мультыварак. Першая дасць вам магчымасць выспацца раніцай, другая падтрымае вячэру цёплай, колькі б вы яе ні адкладалі. Яшчэ адзін важны элемент — клапан, пры дапамозе якога забяспечваецца скідванне пары: опцыя абароніць рукі ад апёкаў пры адчыненні чашы.

Цэны на мультыварккі дастаткова дэмакратычныя: можна знайсці варыянты ад 130—150 рублёў. У сярэднім трэба разлічваць на 300—500 рублёў.

### БЫЛО Б ДАРЭЧЫ...

Калі ваша раніца заўсёды пачынаецца з кубачка кавы, хутчэй за ўсё, вам рана ці позна захочацца купіць **кавамашыну.**

— Для людзей з рознымі рысамі характару, для розных кватэр і бюджэтаў падыдуць зусім розныя кавамашыны, — адзначае кансультант анлайн-крамы бытавой тэхнікі Сяргей. — Таму важна спачатку вывучыць пытанне.

Кропельная кававарка — самая нескладаная і недарагая. Гарачая вада па кроплі сцякае ў фільтр, праходзіць праз молатыя зярняты, узбагачаючыся водарам і густам, і капае ў колбу. Гейзерная кававарка выкарыстоўвае зваротны прынцып: вада падымаецца знізу і заварвае каву. З дапамогай ражковай кававаркі можна прафесійна гатаваць дома не толькі чорную каву, але і капучына. Праўда, спачатку прыйдзецца навучыцца ёй карыстацца — тут патрэбны некаторы спрыт. Капсульныя кававаркі патрабуюць дадатковай пакупкі герметычных капсул са здробненым кававым зернем. Ну, а аўтаматычныя кавамашыны — ідэальны варыянт, але і самыя дарагі (рублёў 1000—1100 за сур'ёзны апарат).

**Тостар,** у прынцыпе, таксама можна ўнесці ў «ліст чакання» — у пару да кавамашыны. Як і **ўвільгатняльнік паветра** — адносна недарагі (у параўнанні з іншай бытавой тэхнікай) падарунак сваёй скуры ў ацяпляльны сезон. І не толькі скуры: медыкі кажуць, што сухое паветра кватэр з цэнтральным ацяпленнем спрыяе схільнасці да прастудных захворванняў.

І, нарэшце, модны гаджэт — **робат-пыласос.** Мілую штуковіну ўладальнікі пазіцыянуюць не як бытавы прыбор, а як цацку і нават (здаецца) гадаванца, калі выкладваюць у Instagram фота і відэа свайго ката ў абдымку з пацешным робатам. Як і пасудамыечная машына, гэта адзін з тых бытавых падарункаў жанчыне, ад якога яна будзе ў захапленні. Але, у адрозненне ад пасудамыйкі, практычная карысць гаджэта тут выклікае пытанні. Ён не вылучаецца праходнасцю і можа «заліпнуць» у адным куце (калі ў вашым доме шмат кутоў, варыянт не для вас), «спатыкаецца» на раскіданых цацках або шкарпэтках, ды і якасць прыбірання хутчэй падтрымлівальная — за ануч час ад часу вам брацца ўсё ж давядзецца. Функцыя «вільготнага прыбірання», так бы мовіць, дэкаратыўная — падлогу якасна робат не вымые. Ён «цягне» электраэнергію і працуе досыць шумна (не так шумна, як класічны пыласос, але на ноч таймер не выставіш). І ўсё ж з яго з'яўленнем у вашым доме стане чысцей (асабліва калі ў вас шмат мэблі на ножках). Ну і яшчэ адзін плюс — робат сапраўды проста мілы. Праўда, выкласці за яго прыйдзецца круглую суму — у сярэднім за якасны прыбор рублёў 800 і вышэй.



### МОЖНА АБЫСЦІСЯ

Пачнём з **фрыцюрніцы** для хатняга выкарыстання. Мода на правільнае харчаванне зрабіла дадзены прыбор не самым патрэбным на кухні. Да таго ж прыборы малой моцнасці не дазваляюць дасягнуць правільнай кансістэнцыі страў (ежа ў іх хутчэй тушыцца), а вялікай моцнасці — займаюць шмат месца, «цягнуць» электрычнасць і шмат каштуюць. Так што, калі час ад часу вам хочацца прыгатаваць што-небудзь «шкоднае, але смачнае», цалкам можна абысціся рондальчыкам з друшляком або адпаведнай функцыяй мультыварккі.

У гэты спіс дададзім і **электрашашлычніцу.** У нашай культуры шашлык — не страва, а выязное мерапрыемства, спосаб правесці выхадны дзень. Тым больш што водар сапраўднага агню прыбор згенерыраваць не ў стане.

**Электрафандзю** — гэты кухонны гаджэт быў у модзе гадоў 15 таму, калі ўсе раптам адкрылі для сябе фандзю. Але, паклаўшы руку на сэрца, як часта вы будзеце гатаваць фандзю? Да таго ж прыбор пасля вячорак з сябрамі вам прыйдзецца разбіраць і адмываць, а адмыць расплаўлены і зноў застылы сыр сапраўды няпроста.

### А ЯНО ВАМ ТРЭБА?

**Ёгуртніцы** нядрэнна прадаюцца на хвалі моды на ЗЛЖ. Але, як правіла, пасля куплі прыбор вельмі хутка адпраўляецца пыліцца на далёкую паліцу. Справа ў тым, што для гатавання хатняга ёгурта трэба купляць закваску і малако пэўнай тлустасці. Можна, вядома, у якасці закваскі выкарыстоўваць крамны ёгурт. Але чаму б тады проста не купіць сабе шкляначку ёгурта і не турбавацца? На **марожаніцах** спыняцца не будзем — яны таксама праз два-тры выкарыстанні кандыдаткі на далёкую паліцу.

**Вафельніца, арэшніца, блінніца** — з той жа серыі. Вафлі і арэшкі са згушчонкай — наўрад ці аснова вашага рацыёну, а блінніца, як аказалася, патрабуе не меншага спрыту, чым смажанне налiснікаў на звычайнай патэльні. На форумах уладальніцы прыбора скардзяцца, што бліны атрымліваюцца тоўстымі і смак у іх не той.

